ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР.

№ 21 (1555) | Аўторак, 14 сакавіка 1961 года | Цана 4 кап.

Цагліна за цаглінай,—
Расце цудоўны гмах!
Квітней, мая краіна,
Бяры шырэй размах!

На здымку: муляр Іван Осіпавіч **Паўлюшчык**, кандыдат у дэпутаты Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў працоўных.

НЯХАЙ ГЭТАЯ СЦЕЖКА СТАНЕ ШЫРОКАЙ ДАРОГАЙ

Нядаўна ў спектаклях Аршанскага і Ашмянскага народных тэатраў прымалі ўдзел артысты-купалаўцы Б. Платонаў, Г. Глебаў, В. Пола, Л. Шынко, рэжысёр К. Саннікаў.

Ім, як і многім іншым артыстам беларускіх тэатраў, не ў навіну выступаць у раённых цэнтрах. Але гэтыя выступленні нічога агульнага не мелі са звычайным выязным спектаклем. Артысты былі ўдзельнікамі спектакляў, пастаўленых народнымі тэатрамі Оршы і Ашмян.

Якое ж было свята ў гэтых беларускіх гарадах! Народныя, праслаўленыя артысты прыехалі браць удзел у самадзейных спектаклях.

Сёння самадзейнае мастацтва ўзнялося на такую высокую хвалю народнай творчасці, што далучыцца да яго маюць за гонар нашы самыя лепшыя майстры тэатра, і не толькі тэатра.

Вось яна, прыкмета нашага часу! Прафесіянальнае і самадзейнае мастацтвы настолькі зблізіліся, што ўжо могуць лёгка падаць руку адно аднаму і ісці поплеч. Не! Не Гуліверамі сярод ліліпутаў адчувалі сябе нашы купалаўскія артысты ў спектаклях народных тэатраў. Яны, вядома, вылучаліся і не маглі не вылучацца сваім цудоўным майстэрствам сярод самадзейных артыстаў. Але самадзейныя артысты глыбока ўскалыхнулі сэрцы сваіх гасцей шчырай непасрэднасцю выканання, палымянай адданасцю любімаму мастацтву.

Усё гэта так гарманічна дапаўняла адно другое на самадзейнай сцэне, што спектаклі «Канстанцін Заслонаў» і «Паўлінка» ператварыліся ў незвычайнае свята, радасць якога аднолькава глыбока перажывалі і гледачы, і артысты. І нашы народныя артысты, можа, упершыню адчулі, што яны сапраўды народныя не па званню, а па сутнасці гэтага пачэснага звання.

Цудоўны пачын зрабілі купалаўцы! Сваім удзелам у самадзейных спектаклях яны запалілі аганькі натхнёнага творчага спаборніцтва ў калектывах народных тэатраў, якія кожны свой новы спектакль цяпер будуць ставіць так, каб не сорамна было ўзяць у ім удзел любому праслаўленаму майстру сцэны. Кожны ўдзельнік такога спектакля будзе раўняцца на ўзоры сцэнічнага майстэрства карыфеяў беларускай сцэны. Добра, вельмі добра, калі артысты нашых тэатраў прыходзяць у самадзейныя калектывы і тлумачаць іх удзельнікам, як трэба паводзіць, трымаць сябе на сцэне, а яшчэ лепш, калі яны **паказваюць** гэта сваім прыкладам, сваім удзелам у самадзейным спектаклі. Такі паказ дае непараўнальна больш, чым любая лекцыя ці нават цэлы семінар.

Нарэшце, і гледачы нашай раённай перыферыі ўбачылі ўзоры сапраўднага сцэнічнага мастацтва і, напэўна ж, павысяць творчыя патрабаванні да сваіх, мясцовых артыстаў і калектываў.

Купалаўцы прысвяцілі свой пачын падрыхтоўцы да XXII з'езду партыі. Хочацца спадзявацца, што і ўсе астатнія тэатры рэспублікі падхопяць гэты цудоўны пачын. У кожным тэатральным калектыве ёсць майстры сцэны, якія сваім удзелам у самадзейных спектаклях абудзяць творчую думку, запаляць агні спаборніцтва за лепшыя спектаклі і тым самым яшчэ вышэй узнімуць творчы ўзровень народнай мастацкай самадзейнасці.

Коласаўцы, брастчане, гродненцы, гамяльчане, магіляўчане, за вамі слова! У вас ёсць Ільінскі, Шэлег, Шмакаў, Абрамаў, Заранок, Цурбакоў, Бульчык і шмат іншых выдатных майстроў беларускай сцэны, якіх з радасцю чакаюць у народных тэатрах вашых абласцей.

Магчыма, што народныя тэатры пачнуць зараз капіраваць рэпертуар сваіх абласных тэатраў з тым, каб мець падставу запрашаць да сябе вядомых майстроў сцэны. Гэта зашкодзіць абодвум тэатрам, і ў першую чаргу — гледачам, якія вымушаны будуць глядзець адны і тыя ж спектаклі, толькі ў пастаноўцы розных калектываў.

Тут дарэчы, наогул трэба сказаць аб пэўным рэпертуарным размежаванні самадзейных і прафесіянальных калектываў.

Зараз вельмі часта бывае так, што той ці іншы абласны драматычны тэатр і народныя тэатры ці проста звычайныя драматычныя самадзейныя калектывы ставяць адны і тыя ж п'есы. «Кухарка», «Няроўны бой», «Два колеры», «Выбух» і многія іншыя п'есы шырока дубліруюцца ў тэатрах і самадзейных калектывах адной і той жа вобласці. У выніку гледачы вымушаны глядзець вельмі мала савецкіх п'ес, а тэатры і самадзейнасць—паўтараюць адзін аднаго.

Абласным дамам народнай творчасці, абласным і раённым аддзелам культуры неабходна ў такіх выпадках звяраць рэпертуарныя планы самадзейных калектываў з планавымі пастаноўкамі свайго абласнога тэатра. Зразумела, кожнаму самадзейнаму калектыву хочацца паставіць самую лепшую п'есу, але не ўсе лепшыя п'есы ставяцца ў абласных тэатрах. Нашы абласныя дамы народнай творчасці яшчэ не навучыліся выкарыстоўваць усё багацце сённяшняй савецкай драматургіі, шукаць і рэкамендаваць самадзейнасці п'есы, міма якіх, часам, праходзяць па той ці іншай прычыне абласныя тэатры. А такіх п'ес даволі многа. Яны маглі б значна ўзбагаціць рэпертуар самадзейнасці.

Добра было б, каб і Міністэрства культуры памагло ў справе перакладаў на беларускую мову п'ес і распаўсюджванню іх па народных тэатрах і самадзейных калектывах.

Пачын купалаўцаў прымушае задумацца і над іншымі пытаннямі.

Калі сёння наша самадзейнае мастацтва дасягнула такога ўзроўню, што вядучыя майстры тэатра лічаць за гонар выступаць поруч з аматарамі, дык ці не варта больш уважліва прыглядзецца да самадзейных артыстаў. Можа, сярод аматараў ёсць і такія, хто папоўніў бы тэатры? Тыя ж самыя Б. Платонаў, Г. Глебаў, В. Пола, ды і пераважная большасць сённяшніх вядомых майстроў сцэны, таксама прыйшлі з самадзейнасці.

Але сёння патэнцыяльных Платонавых і Глебавых куды больш, чым калі-небудзь, тоіцца сярод аматараў мастацтва. Чаму ж сёння мы не бачым іх на прафесіянальнай сцэне? Відаць, таму, што нашы тэатры развучыліся шукаць іх, спадзеючыся на тых акцёраў, якіх штогод рыхтуе Тэатральна-мастацкі інстытут.

Але ў інстытут лягчэй трапіць са школьнай парты, чым з самадзейнага калектыву, бо не ўсе таленавітыя народныя самародкі скончылі дзесяцігодку і не ўсім ім 18—20 год. Таленавітыя прадстаўнікі самадзейнасці маюць надзвычай абмежаваны доступ у інстытут.

У такім разе, можа, варта падумаць, каб аднавіць студыі пры тэатрах? Але аднавіць на такой базе, каб у іх можна было прымаць жадаючых не толькі з таго горада, дзе знаходзіцца тэатр, але і з усёй рэспублікі. У Тэатры імя Я. Коласа віднае месца заняла маладая таленавітая актрыса Л. Куцькіна. Яна скончыла не тэатральны інстытут, а студыю пры тэатры, якая не перашкодзіла ёй адначасова скончыць і вячэрнюю дзесяцігодку.

Якія яшчэ тэатры могуць пахваліцца знойдзенымі ў народзе за апошні час таленавітымі самародкамі, што з поспехам выступаюць сёння на іх сцэне? Такіх тэатраў сёння, на жаль, амаль няма. А драматычная самадзейнасць заўсёды была і застаецца найбольш надзейнай і самай багатай крыніцай папаўнення прафесіянальных тэатраў. Іменна драматычная самадзейнасць дала самыя яркія таленты не толькі беларускай, але і ўсёй савецкай сцэне.

Дык чаму ж нашы тэатры і Тэатральна-мастацкі інстытут не шукаюць формы максімальнага і найбольш плённага выкарыстання невычэрпнай крыніцы народных талентаў? Можа варта запрашаць часам таленавітага самадзейнага артыста сыграць у спектаклі на сцэне прафесіянальнага тэатра.? Знайшлі ж такім чынам у Ленінградзе самадзейнага артыста Гарбачова, які зараз з поспехам выступае на сцэне Вялікага драматычнага тэатра.

У сённяшняй размове нельга абмяжоўвацца толькі пытаннямі тэатра і тэатральнай самадзейнасці, бо выезд купалаўцаў у народную самадзейнасць адкрыў туды дарогу не толькі майстрам сцэны. Па гэтай дарозе могуць пайсці і майстры жывапісу, музыкі, харэаграфіі.

Амаль пры кожным абласным Доме народнай творчасці ёсць студыі ці гурткі выяўленчага мастацтва, харавыя, танцавальныя калектывы. Да іх яшчэ часам прыязджаюць мастакі, музыканты, хармайстры. А ёсць жа нямала таленавітых калектываў у калгасах, саўгасах, раённых цэнтрах рэспублікі. Частымі гасцямі бываюць там Р. Шырма, Г. Цітовіч.

Але ці часта там можна сустрэць нашых праслаўленых балярын, салістак і салістаў опернай сцэны, кампазітараў і музыкантаў? Гаворка ідзе не аб парадных візітах, якія часам і бываюць, а пра самую звычайную дапамогу. Р. Шырма і Г. Цітовіч не наогул прыязджаюць у той ці іншы калектыў, а практычна паказваюць яму, як трэба развучваць песню, памагаюць папоўніць рэпертуар.

Вось такой практычнай дапамогі чакае наша самадзейнасць ад вас, дарагія таварышы мастакі, балетмайстры, балярыны, салісты, кампазітары, музыканты, напярэдадні XXII з'езду Камуністычнай партыі!

Няхай жа сцежка, пракладзеная купалаўцамі да народных талентаў, стане шырокай дарогай!

На здымку: народны артыст СССР **Г. Глебаў** гутарыць з самадзейнымі артыстамі Ашмянскага народнага тэатра.

Занядбаныя клубы і абыякавыя гаспадары

У творчай працы растуць нашы людзі. З кожным днём паляпшаецца іх матэрыяльны дабрабыт. Багацее не толькі дом і стол. Душа — таксама. Пашыраецца кругагляд, узрастаюць культурныя запатрабаванні. І гэта натуральна: чалавек, які будуе камуністычнае грамадства, імкнецца да ведаў, да жыцця прыгожага і змястоўнага.

Мы пацікавіліся, як задавальняюцца гэтыя патрэбы працоўных у Бярэзінскім раёне.

ПАД БОКАМ У ВАС, КІРАЎНІКІ

Раённы Дом культуры — не толькі месца адпачынку жыхароў гарадскога пасёлка. Ён павінен быць цэнтрам масавай работы, метадычнай дапамогі сельскім клубам, цесна звязаным з жыццём калгасаў і саўгасаў, з перадавікамі вытворчасці, якіх народ шаноўна называе маякамі сямігодкі, прапагандаваць дасягненні перадавікоў.

Для шырокага разгортвання масавай работы ў гарадскім пасёлку ёсць і ўмовы, і культурныя сілы: музыканты, урачы, аграномы, настаўнікі. Ёсць каму і цікавую лекцыю прачытаць, і кніжны агляд зрабіць, і станцаваць, і праспяваць. Набыты струнныя і духавыя музычныя інструменты, баян. Але іх не могуць скарыстаць.

— З дырэктарамі не шанцуе. Адну звольнілі, не справілася. Другую прызначылі —і зноў не клеіцца, — гавораць кіраўнікі Бярэзінскага аддзела культуры М. Сакаў і А. Пенкрат.

У раённым Доме культуры кожны раз у суботу і нядзелю адно і тое ж: факстроты пад радыёлу. Які ж гэта метадычны цэнтр, калі нават сваіх удзельнікаў мастацкай самадзейнасці на рэпетыцыі сабрać не могуць? Як жа яны могуць цікавіцца работай сельскіх клубаў і дапамагаць ім? Часам з раёна выязджае агітбрыгада ў які-небудзь саўгас ці калгас. Але карысці з яе не вельмі многа: майстэрства выканання настолькі прымітыўнае, што сельскім клубам павучыцца няма чаму.

Не могуць знайсці дзейсных форм масавай работы? Не, гэтага нельга сказаць. Калі захочуць, знаходзяць. Нядаўна раённая бібліятэка (загадчыца Б. Левіна) правяла канферэнцыю «Чалавека славіць праца» ў аддзяленні саўгаса «Камунар», дзе даяркі заваявалі першынство ў сацыялістычным спаборніцтве па надоях малака за студзень. На канферэнцыі выступілі перадавая даярка т. Кісель, упраўляючы аддзялення т. Сіняк, сакратар партыйнай арганізацыі т. Крот. Затым зачыталі загад дырэктара, у якім аб'яўлялася падзяка лепшым працаўнікам фермы, прывітальныя тэлеграмы з іншых аддзяленняў саўгаса, уручылі Ганаровыя граматы. Агітбрыгада наладзіла канцэрт. Жывёлаводы шчыра дзякавалі арганізатарам канферэнцыі, прасілі прыязджаць часцей.

Карысць ад такога мерапрыемства відавочная. На жаль, гэта толькі адзінкавы прыклад.

ЗАЦІШАК, СПАКОЙ

У адным будынку з канторай аддзялення Котава (саўгас «Паплавы») размешчан сельскі клуб і бібліятэка. Знаёмімся з наглядная агітацыяй.

На сцяне паказчыкі спаборніцтва жывёлаводаў саўгаса за... верасень 1960 года! Перад вокнамі ў газетнай вітрыне шматком звісла «Калгасная праўда» дваццацідзённай даўнасці. Нішто сабе наглядная агітацыя!

Прайшоў студзеньскі Пленум ЦК КПСС. Рашэнні яго рабочыя саўгаса ўспрынялі як сваю баявую праграму. Адбываюцца сходы, людзі спрачаюцца, уносяць прапановы, думаюць. А ў культурна-асветнай установе зацішак, спакой.

Котаўская моладзь добра працуе. У аддзяленні створаны чатыры камсамольска-маладзёжныя ільнаводчыя звяны, праводзяцца нядзельнікі па збору попелу, вывазцы ўгнаенняў. Але ж трэба было, каб партарганізацыя, дырэкцыя падумалі і пра адпачынак моладзі. Нямногага патрабуюць камсамольцы: набыць якія-небудзь настольныя гульні, перанесці з канторы ў клуб тэлевізар, прыдбаць больш новай літаратуры. Усё гэта слушныя патрабаванні. Толькі ні рабочы камітэт, ні партыйная арганізацыя саўгаса не хочуць прыслухацца да іх.

— Нельга працаваць у клубе. З пачатку восені ні разу печы не паліліся, дроў няма, — скардзіцца загадчыца клуба М. Смольская.

Замест таго, каб дапамагчы загадчыцы, у раённым аддзеле культуры прыдумваюць спосабы, каб зняць камсамолку з работы.

— Нам патрэбен баявы хлопец, які пастаяў бы за сябе. А то што гэта за работніца — дроў нават не знойдзе...

У Бярэзіне ўвайшло ў звычку: кінамеханікі, якія працуюць у саўгасах, каб напаліць перад сеансам у клубе, ідуць у лес і самі дровы нарыхтоўваюць.

Так і выходзіць: людзі добра працуюць, імкнуцца да прыгожага, культурнага жыцця. А ўмовы? Іх няма. Культура тут саматужная: танцы — у паліто, кіно — у халодным клубе, кнігі — заляжалыя, старасвецкія.

У Лагінскім клубе таго ж саўгаса ўмовы не лепшыя. Тут да нявырашанай «паліўнай праблемы» дабавілася яшчэ «праблема з рамонтам». Калі на вуліцы адліга, праз дзіравы дах і столь цячэ вада. У завею снегу намятае праз выбітыя шыбы. А побач з клубам працуе саўгасная цыркулярка, выробляецца дошчачка. Калі б кіраўніцтва саўгаса было зацікаўлена, рамонт даўно правялі б.

ЯК «ПЕРАВОДЗІЛІ АДЗІНКУ»

У вёсцы Мікулічы калгас пабудаваў некалі нядрэнны клуб. Была і самадзейнасць, і вечары адпачынку праводзіліся. І вось гаспадаром клуба стаў саўгас «Паплавы». Наведаліся сюды прадстаўнікі рабочага камітэта і заявілі:

— Пабудуем тут кінаапаратную, стацыянар свой будзе. Няхай адпачывае рабочы клас.

Радаваліся ў Мікулічах: будзе дзе вольны час правесці. Але радасць была заўчаснай. Усё раптам павярнулася інакш. Клуб закрылі. Далі Соф'і Харытановіч, якая жыве паблізу, замок і наказалі:

— Калі кіно прывязуць, адмыкаць будзеш.

Праўда, цяпер клуб не замыкаецца, бо Соф'я ключ недзе згубіла. Печы няспраўныя, у вокнах ніводнай шыбы, дах цячэ, было некалькі крэслаў, дык і тыя ў кантору забралі. Бярвенні, што моладзь нарыхтавала на апаратную, упраўляючы аддзялення т. Дзянісевіч загадаў распілаваць на дошкі ды скрыні парабіць бульбу вазіць. Кінаапаратура, якую завезлі з Мінска, і па сённяшні дзень ляжыць на складзе.

Здавалася б, аддзел культуры паклапоціцца, каб у саўгасе аднавілі работу клуба. Але М. Сакаў не стаў настайваць, моўчкі пагадзіўся з бяздзейнасцю. Не захацеў псаваць адносіны з дырэктарам саўгаса т. Першынам: ён жа член выканкома раённага Савета дэпутатаў працоўных...

Выканком райсавета таксама заняў дзіўную, беспрынцыповую пазіцыю. Спачатку, у лістопадзе, абавязаў Першына адрамантаваць клуб, падрыхтаваць яго да работы ў зімовых умовах. А калі праз тры месяцы Першын і не падумаў узяцца за рамонт, прынялі новае рашэнне: «У сувязі з тым, што Мікуліцкі клуб не рамантуецца... перавесці адзінку загадчыка клуба ў калгас імя Мічурына»

Вельмі лёгка «перавесці адзінку»— напісаў і зроблена. Куды цяжэй стварыць умовы для культурна-асветнай работы там, дзе кіраўнікі, падобныя да Першына, не хочуць іх ствараць.

ХТО Ж ГАСПАДАР?

Занядбаны і іншыя саўгасныя клубы ў раёне. Пры двух гаспадарах— аддзеле культуры і рабачкомах саўгасаў—стаяць асірацелыя будынкі клубаў у вёсках Барсукі, Гацец, Прыборкі, Кукарава і інш., якія належаць саўгасам «Паплавы», «Змітровічы», «Камунар».

— Не нашы гэта клубы, а прафсаюзныя,—апраўдваецца М. Сакаў.— Каб яны аддалі памяшканні нам, мы б там даўно парадак навялі. А так няхай самі робяць, што хочуць.

— На клубную работу ў нас сродкаў няма,—заяўляе бухгалтар саўгаса «Змітровічы» т. Луніна і пагражае аштрафаваць бухгалтара аддзялення т. Пархомчыка, які выдзеліў крыху грошай для патрэб клуба.

Кіраўнікі Бярэзінскага аддзела культуры М. Сакаў і А. Пенкрат не супраць пахваліцца колькасцю кінасеансаў, працэнтамі выканання фінансавага плана. Кінаабслугоўванню насельніцтва ў раёне аддаецца немалая ўвага. Затое амаль нічога станоўчага не скажаш пра пастаноўку культасветработы, асабліва ў саўгасах.

У параўнанні з другімі крыху лепш працуе Ляжынскі сельскі клуб (загадчык С. Ванкевіч), тут прыгожа афармлен «Каляндар працоўнай славы». Праз два—тры дні лісток яго мяняецца. Цяпер сюды занесена імя даяркі Веры Сярмяжкі. Ёсць стэнд «За высокія надоі малака», на якім паказана, хто ідзе ўперадзе і хто адстае, стэнд «За што змагаецца аддзяленне Ляжына ў 1961 г.» Абсталяваны куток «Навука і рэлігія». Агітбрыгада клуба нядаўна выязджала з дакладам і канцэртам у вёску Паплавы. Гэты клуб больш-менш трапляе ў нагу з кіпучым жыццём, імкнецца задавальняць культурныя запатрабаванні працоўных. Ёсць у яго рабоце нейкая адзнака сённяшняга часу, якой не хапае яшчэ многім культурна-асветным установам раёна.

З месяца ў месяц не спыняецца ў Бярэзіне прыкрая цеганіна за капейку паміж аддзелам культуры і саўгасамі. Адны выстаўляюць рахункі: плаціце за арэнду памяшкання, за дровы. Другі бок таксама не маўчыць: а вы нам—за ўборку клуба, за сельскагаспадарчыя фільмы. Спрэчкі ідуць. Яны шкодзяць справе. Людзям культура і веды патрэбны, а не размовы наконт іх паміж ведамствамі.

Калі ўжо там, дзе ёсць клубы, хаты-чытальні, масавая работа занядбана, дык што гаварыць пра дзесяткі вялікіх і малых вёсак у саўгасах, дзе ўстаноў культуры або знаходзяцца ў прыватных памяшканнях, або іх зусім няма. Цяжка так данесці культуру да кожнай вёскі, да кожнага чалавека. А ён жа мае на яе роўныя з усімі правы.

* * *

Такое трывожнае становішча з саўгаснымі клубамі не толькі ў Бярэзінскім раёне. Нядаўна ў рэдакцыю прыйшло пісьмо з Крывіцкага раёна. Ад імя рабочых аддзялення саўгаса загадчык Осаўскага сельскага клуба К. Хацяновіч піша: «Осаўскі клуб знаходзіцца ў памяшканні саўгаса «Крывічы». Клуб даўно патрабуе рамонту, а рабіць яго ніхто не збіраецца. Сельскі Савет не адпускае грошай, спасылаючыся на тое, што гэта памяшканне саўгаса. А ў саўгасе кажуць, што на рамонт сродкаў няма. Клуб цесны, няўтульны, без сцэны, падлога прагніла. А ён жа тут адзін на сем вёсак».

Недахопаў у разгортванні культурна-масавай работы ў саўгасах многа. Іх было б значна менш, калі б мясцовыя партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі больш уважліва ставіліся да задавальнення культурных запатрабаванняў рабочых, па-сапраўднаму клапаціліся аб тых культурна-асветных установах, якія ёсць на тэрыторыі саўгаса. Інакш партыйная арганізацыя і не здолее весці змястоўную, мэтанакіраваную выхаваўчую работу сярод працаўнікоў вёскі.

Натхнёныя рашэннямі студзеньскага Пленума ЦК КПСС, рабочыя саўгасаў рэспублікі змагаюцца за далейшы ўздым гаспадарак, шукаюць і прыводзяць у рух новыя і новыя рэзервы. І недаравальна, што культурна-асветныя ўстановы ў гэтым імклівым руху наперад часта не дасягаюць парэдняга краю барацьбы, цягнуцца недзе ў абозе. А месца іх— разам з усімі, на рубяжах сямігодкі.

А. БЕЛАВУС,
(Спец. кар. «Літаратуры і мастацтва»).

Тэма заняткаў—опернае мастацтва

Сотні слухачоў сабраліся на чарговыя заняткі ўніверсітэта культуры, што працуе пры Глыбоцкім раённым Доме культуры Віцебскай вобласці. Аб развіцці рускай класічнай оперы, аб выдатных оперных творах савецкай музыкі прысутным расказалі музыказнаўца І. Нісневіч і народны артыст СССР Я. Цікоцкі.

У канцэртную частку заняткаў былі ўключаны песні і арыі з опер І. Дзяржынскага «Ціхі Дон» і «Узнятая цаліна», Ц. Хрэннікава «У буру», Я. Цікоцкага «Дзяўчына з Палесся». Руская класіка была прадстаўлена ўрыўкамі з опер М. Мусаргскага, М. Рымскага-Корсакава, М. Глінкі. Іх выканалі артысты Г. Агніўцава і Ю. Матраеў.

Канцэртная брыгада Саюза кампазітараў БССР выступіла таксама перад слухачамі ўніверсітэта культуры ў Паставах, дзе адбыліся заняткі прысвечаныя беларуская сучаснай музыцы.

Купалаўскі вечар

У Літаратурным музеі Янкі Купалы адбыўся вечар «Памяці паэта». У лекторыі музея сабраліся вучні 16-ай і 31-ай школ рабочай моладзі г. Мінска, рабочыя.

Перад прысутнымі выступіў народны скульптар Беларусі З. Азгур. Ён расказаў аб сваіх сустрэчах з паэтам. Чулы, абаяльны чалавек, Я. Купала заўсёды з'яўляўся для тады яшчэ пачынаючага скульптара ўважлівым сябрам і настаўнікам. Купала цікавіўся лёсам беларускага мастацтва і дапамагаў маладым таленавітым мастакам з народа набыць адукацыю, каб затым у іх асобе ўбачыць сапраўдных, вартых свайго народа, жывапісцаў і скульптараў. Адным са студэнтаў, якім дапамагалі вучыцца Купала і Колас, быў і З. Азгур. На працягу многіх год З. Азгур у сваіх работах імкнуўся паказаць вялікі гуманізм, душэўнае хараство Янкі Купалы. Пра гэта ён цікава расказваў у сваім выступленні.

Вершы, прысвечаныя Я. Купалу, прачытаў паэт М. Аўрамчык.

З успамінамі аб сустрэчах з Я. Купалам выступіў вучоны сакратар музея, літаратурны крытык А. Есакоў.

А. ЛАМАКА.

ПАМЯЦІ ВЯЛІКАГА КАБЗАРА

Па ўсім Савецкім Саюзе адбыліся ўрачыстасці, прысвечаныя памяці Тараса Рыгоравіча Шаўчэнкі.

Старшыня Усесаюзнага шаўчэнкаўскага камітэта паэт М. Грыбачоў, адкрываючы ўрачыстае пасяджэнне ў Вялікім тэатры г. Масквы, падкрэсліў, што Шаўчэнка быў заснавальнікам новай украінскай літаратуры, росквіт якой мы бачым сёння. Ён зрабіў велізарны ўплыў на грамадскую думку і літаратуру ўсіх народаў Расіі, і ў першую чаргу—славянскіх. Творчасць Шаўчэнкі—нацыянальная па форме, агульначалавечая па зместу—стала здабыткам сусветнай культуры.

У прэзідыуме ўрачыстага пасяджэння—вядомыя савецкія пісьменнікі, госці з Украіны і іншых братніх рэспублік, члены савецкага Камітэта Абароны Міру. Прысутнічалі прадстаўнікі зарубежных краін, а таксама сваякі паэта Д. Ф. Красіцкі і А. Е. Лысенка.

З палымяным словам, поўным любві і пашаны да свайго вялікага земляка, выступіў старшыня праўлення Саюза пісьменнікаў Украіны А. Ганчар.

З вялікай увагай былі выслуханы прамовы старшыні савецкага Камітэта Абароны Міру М. Ціханава, прэзідэнта Акадэміі мастацтваў СССР Б. Іягансона, старшыні праўлення Саюза пісьменнікаў Узбекістана К. Яшэна, члена цэнтральнага праўлення Саюза польскіх пісьменнікаў паэта С. Пеншака, балгарскага паэта Д. Методзіева, чэшскага пісьменніка М. Дрозда.

На ўрачыстым пасяджэнні было зачытана прывітанне сакратарыята Сусветнага Савета Міру.

На ўрачыстым вечары прысутнічалі Л. І. Брэжнеў, М. Г. Ігнатаў, Ф. Р. Казлоў, А. М. Касыгін, А. І. Мікаян, Н. А. Мухітдзінаў, М. А. Суслаў, К. А. Фурцава, П. М. Паспелаў.

* * *

Грамадскасць Мінска таксама ўрачыста адзначыла гэты дзень. У памяшканні акруговага Дома афіцэраў адбыўся вечар, прысвечаны вялікаму Кабзару.

У прэзідыуме ўрачыстага пасяджэння сакратар ЦК КПБ В. Ф. Шаура, сакратары гаркома КПБ А. А. Савельеў і А. Ц. Караткевіч, міністр культуры БССР Р. Я. Кісялёў, украінскія пісьменнікі М. Нагнібіда, Т. Масэнка, А. Ільчанка, Б. Сцепанюк, латышскі пісьменнік Ф. Ракпелніс, беларускія пісьменнікі і паэты: М. Лынькоў, І. Шамякін, Я. Маўр, І. Грамовіч, І. Гурскі, М. Калачынскі, М. Ткачоў і інш.

Вечар адкрыў народны пісьменнік БССР Кандрат Крапіва.

Доктар філалагічных навук В. Барысенка зрабіў даклад аб жыцці і творчасці Тараса Шаўчэнкі.

Потым з чытаннем твораў, прысвечаных Кабзару, выступілі паэты М. Нагнібіда, К. Кірэенка, А. Ільчанка, А. Вялюгін, М. Калачынскі, Б. Сцепанюк, П. Прыходзька, Я. Пушча, Ф. Ракпелніс.

Украінскі паэт Т. Масэнка расказаў, як на Украіне шануюць памяць Шаўчэнкі, прачытаў вершы.

Вечар закончыўся мастацкай часткай. Былі выкананы ўкраінскія народныя песні і танцы, чыталіся вершы і выконваліся песні на словы Шаўчэнкі. У канцэрце прынялі ўдзел Народны аркестр БССР пад кіраўніцтвам народнага артыста БССР І. Жыновіча, заслужаны артыст БССР В. Глушакоў, артысты Д. Зубрыч, Н. Нікеева, В. Фамічэнка, М. Пятроў, В. Ганчарэнка, заслужаная артыстка Таджыкскай ССР І. Савельева, В. Давыдаў і танцавальны калектыў палітэхнічнага інстытута.

У Барысаўскім гарадскім

Мацея Паўлавіча Маўчанскага — дырэктара Барысаўскага гарадскога Дома культуры імя М. Горкага—мы сустрэлі ля білетнай касы. Акружаны наведвальнікамі, ён гаварыў:

— Усе білеты прададзены. Прыходзьце, калі ласка, да нас заўтра.

Нам Мацей Паўлавіч растлумачыў:

— Шосты спектакль наш Народны тэатр ставіць, а гледачоў хоць адбаўляй...

Маўчанскі запрасіў нас у вестыбюль, паказаў лекцыйную залу і пакой для культурнага адпачынку наведвальнікаў.

Тут усюды чыста, утульна, на сценах—партрэты, заклікі. У пакоі для адпачынку—тэлевізар, більярд, шахматы, свежыя газеты, часопісы, брашуры. Тут жа стол даведак, над якім—шыльдачка: «Пытайцеся — адкажам».

У вестыбюлі ўвагу наведвальнікаў прыцягваюць дыяграмы росту прамысловасці і сельскай гаспадаркі ў краіне, ілюстрацыі да кінакарцін і спектакляў. А вось прыгожа афармлены стэнд «За што змагаюцца барысаўчане ў сямігодцы».

Пры Доме культуры ёсць харавая капэла, у якой больш за 70 выканаўцаў. Працуюць самадзейныя калектывы: танцавальны, акрабатычны, струнны. А летась пры Доме культуры распачала заняткі дзіцячая студыя выяўленчага мастацтва. Наведвае яе дваццаць пяць школьнікаў. Кіруюць студыяй вопытны мастак Дома культуры С. Мерзаян і мастак-самавук В. Крычэўскі.

Цікавая работа праводзіцца са школьнікамі Барысава. Для іх арганізоўваюцца канферэнцыі па прачытаных кнігах, сустрэчы з пісьменнікамі. У Доме культуры піянеры праводзяць зборы дружын, ранішнікі, праглядаюць дзіцячыя кінафільмы.

— Не забываемся мы і пра хатніх гаспадынь,—гаворыць Мацей Паўлавіч.—Ужо шосты год у нас працуюць курсы крою і шыцця.

Кожны год пры Доме культуры імя Горкага праводзіцца выстаўка мод: «Як прыгожа і танна апранацца». На гэтых выстаўках экспануюцца мадэлі адзення, створаныя выпускнікамі курсаў.

Ёсць курсы і машынна-мастацкай вышыўкі. Работы вышывальшчыц у мінулым годзе экспанаваліся на абласной выстаўцы народнай творчасці.

Працуе ўніверсітэт культуры. Два разы ў месяц для яго слухачоў праводзяцца заняткі.

Калектыў Дома культуры з гаркомам камсамола і гарадской бібліятэкай разам наладжваюць тэматычныя вечары. Цікавым і змястоўным быў вечар «Нам кніга будаваць і жыць памагае». У цэнтры ўвагі былі творы, напісаныя беларускімі пісьменнікамі ў апошнія гады. На вечары прысутнічалі пісьменнікі І. Мележ і Ул. Шахавец.

Добрае ўражанне пакінулі ў барысаўчан вечары «Вайна не павінна паўтарыцца» і «Куды б нас Радзіма ні паслала...» У першым вечары прымалі ўдзел былыя воіны Савецкай Арміі, партызаны. На другі вечар была запрошана моладзь горада і раёна. Цікавымі былі расказы людзей, якія працавалі на цалінных землях. На гэтым вечары больш дваццаці пяці камсамольцаў заявілі аб сваім жаданні паехаць працаваць на новабудоўлі сямігодкі і ў раёны цалінных зямель.

На кожным тэматычным вечары самадзейныя артысты Дома культуры давалі канцэрты.

Пры Доме культуры працуе метадычны кабінет, які дапамагае самадзейнасці горада і раёна. Тут вы заўсёды знойдзеце новыя п'есы, творы для дэкламатараў, песні, атрымаеце параду, як падрыхтаваць спектакль, развучыць, песню.

Пры Доме культуры працуе агітбрыгада. У яе праграме—песні, танцы, інтэрмедыі, акрабатычныя нумары, частушкі, складзеныя на мясцовым матэрыяле. Летась агітбрыгада дала для барысаўчан і калгаснай вёскі сорак два канцэрты. Таксама наладжваліся выезды ў калгасы Смалявіцкага, Нясвіжскага, Слуцкага і іншых раёнаў. Усюды гледачы цёпла сустракалі таленавітых калектыў Барысаўскага гарадскога Дома культуры. Аб гэтым яскрава сведчаць шматлікія запісы ў «Кнізе водгукаў».

І. СІНЯЎСКІ.

МОЛАДЗІ — ТВОРЧЫ ПРАСТОР

Падрыхтоўка творчай змены — бадай найвастрэйшая праблема для беларускіх тэатраў. Айчынная вайна спыніла вучобу моладзі ў Мінскім тэатральным вучылішчы, у студыях пры беларускіх тэатрах. У выніку тэатры не маглі падрыхтаваць маладую змену старэйшым майстрам. Гэта вельмі адчуваецца ў спектаклях, дзе занята пераважна моладзь. Гледачы выказваюць часам незадавальненне: маўляў, які ж гэта акадэмічны тэатр, калі прыгадаць, скажам, такія спектаклі купалаўцаў, як «Выбух», «Праз дваццаць год», «Пакуль вы маладыя»; — занадта відавочная розніца ў майстэрстве акцёраў розных пакаленняў.

Бясспрэчна, творчая сталасць — майстэрства, пачуццё ансамблю, высокі ўзровень культуры выканання — прыходзяць з гадамі вялікай напружанай працы. Акцёрскія таленты Уладзіміра Крыловіча, Ларысы Александроўскай, Барыса Платонава, Лідзіі Ржэцкай, Аляксандра Ільінскага і многіх іншых, цяпер праслаўленых артыстаў, ярка блішчалі на самадзейнай сцэне яшчэ да прыходу іх у прафесіянальны тэатр. Аднак іх універсітэтам была не толькі выдатная практыка пад кіраўніцтвам вопытнай і таленавітай рэжысуры, але і тая сістэматычная, без адрыву ад сцэны вучоба, якая ў савецкім тэатры стала правілам. А самае галоўнае, што найбольш спрыяла шпаркаму росту майстэрства памянёных артыстаў, — няспынная самаадукацыя, настойлівая работа над сабою.

Гэтая работа неабходна акцёру так, як музыканту і спеваку неабходны штодзённыя практыкаванні. Калі акцёрскі дзень не пачнецца з раніпіх хатніх заняткаў рытмапластыкай і практыкаваннямі на скорагаворках для выпрацоўкі выразнай дыкцыі, — гэты дзень акцёр пражыў бескарысна для сваёй прафесіі, абакраў самога сябе. Калі актрыса перастала аддаваць увагу свайму вонкаваму выгляду яе сцэнічны век будзе вельмі кароткі, а крыўда на лёс — вялікай.

У 20-я гады ў доме адпачынку работнікаў мастацтва ў Місхоры на паўднёвым узбярэжжы Крыма мне даводзілася наглядаць, як Валерыя Барсава раніцою займалася гімнастычнымі практыкаваннямі, а пасля заплывала далёка ў мора і спявала, умацоўваючы галасавыя звязкі ранішнім азонам; як тады яшчэ малады Давід Ойстрах тройчы на дзень хадзіў са скрыпкай у горы, каб, нікому не перашкаджаючы, займацца практыкаваннямі; як добра вядомы ўжо ў тыя часы акцёр Маскоўскага акадэмічнага Малога тэатра Аляксандр Астужаў хадзіў на досвітку да рыбакоў, дапамагаў ім выгружаць начны ўлоў.

Артыст, калі ён сапраўдны мастак, а не саматужнік, павінен штодзённа працаваць над сабою, вывучаць людзей, жыццё, многа бачыць і чытаць, інакш ён не будзе здольны апраўдаць свайго высакароднага прызначэння «глаголом жечь сердца людей».

Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут робіць вялікую справу па выхаванню здольнай тэатральнай моладзі; кожны год ён выпускае групу (праўда, вельмі невялічкую) маладых акцёраў. Аднак з тае прычыны, што выпускнікі інстытута не маюць сталай практыкі ў час навучання, ім даводзіцца яшчэ пэўны час давучвацца ў тэатрах нават па такіх дысцыплінах, як... сцэнічны рух і пастаноўка голасу. Студыі пры тэатрах падрыхтоўваюць больш спрактыкаваных акцёраў, бо студыйцы сумяшчаюць вучобу з практыкай, якая ў студыях з'яўляецца галоўнай дысцыплінай. Беларускія тэатральныя студыі далі такіх вядомых артыстаў, як народны артыст БССР Ул. Бульчык, заслужаныя артысты рэспублікі М. Яроменка, С. Яворскі, артысты Г. Арлова, Е. Рынковіч, Г. Макарава, Л. Куцькіна, М. Бабок, В. Белахвосцік і інш.

Аднак сучаснаму тэатру патрэбны акцёры з вышэйшай адукацыяй, якія панясуць у народ высокую сцэнічную культуру, бо савецкі тэатр — тэатр вялікай думкі і дасканалай формы. Ён павінен з кожным годам усё больш рашуча пазбаўляцца ад саматужніцтва, ад акцёраў, якія не валодаюць неабходнай эрудыцыяй, добра пастаўленымі галасамі, яркімі эмоцыямі, пластычным рухам і г. д. На жаль, сёння мы яшчэ сустракаемся з фактамі, калі спектакль прафесіянальнага тэатра ў паасобных сцэнах мала чым адрозніваецца ад самадзейнага.

Заўтрашні дзень тэатральнага мастацтва будзе адметны яшчэ большым пашырэннем творчага дыяпазону, бо мастацкія густы савецкага гледача, яго патрабаванні да тэатраў імкліва растуць. І народныя тэатры хочуць бачыць у прафесіянальных спектаклях высокія ўзоры для сваёй аматарскай дзейнасці. Вось чаму на нашу тэатральную моладзь ускладаецца вельмі вялікая і адказная задача не толькі быць на ўзроўні часу, але і глядзець уперад, узнімаць культуру сваёй творчасці на ўсё большую вышыню.

З кім жа мы ідзём у заўтрашні дзень? Хто ідзе на змену слаўнай кагорце старых майстроў тэатра?

Хачу адразу агаварыцца, што мая размова аб моладзі не прэтэндуе на паўнату або безапеляцыйнасць меркаванняў. Я буду зыходзіць з вынікаў нядаўняга агляду творчай моладзі тэатраў рэспублікі, прысвечанага саракагоддзю камсамола Беларусі.

Агляд і далейшае знаёмства з маладымі акцёрамі паказалі значны зрух у справе вылучэння маладых выканаўцаў у тэатрах рэспублікі, іх творчы рост.

Выпускнік Беларускага тэатральнага інстытута В. Тарасаў у Тэатры імя Янкі Купалы за параўнальна невялікі час здолеў паспяхова сыграць значныя ролі. Складаную ролю здолеў асэнсаваць В. Тарасаў у спектаклі «Уваскрэсенне». Яго Няхлюдаў — арганічнае ўвасабленне класічнага вобраза, сугучнае ўсяму ансамблю спектакля. Свае цікавыя акцёрскія магчымасці, прывабную прастату і стрыманасць В. Тарасаў дэманструе і ў вобразах нашых сучаснікаў. Тут і рамантычны Сяргей у спектаклі «Веру ў цябе» і ўдумлівы і рашучы Кузьмін у спектаклі «Людзі і д'яблы» К. Крапівы. Выкананне гэтых ролей сведчыць аб шырокіх магчымасцях маладога здольнага акцёра, аб добрых перспектывах яго творчай дзейнасці, калі ён будзе патрабавальна ставіцца да сваёй працы.

Вельмі цікавыя акцёрскія дадзеныя і творчыя магчымасці ў артыста Рускага тэатра імя М. Горкага Р. Янкоўскага. Ужо ў выкананні ролі Віктара («Іркуцкая гісторыя») малады акцёр паказаў, якой багатай палітрай фарбаў валодае ён. Вобраз раскрыты глыбока і шматгранна.

Вызначылася выпускніца студыі Тэатра імя Янкі Купалы М. Бабок у спектаклі «Іркуцкая гісторыя», пастаўленым коласаўцамі. Маладая актрыса паказала сваё ўменне данесці да гледача глыбокую праўду пачуццяў Валі, паказаць тыповыя рысы характару гераіні.

З кожнай новай роллю ўсё больш выяўляецца драматычны талент маладой актрысы Тэатра імя Янкі Купалы М. Захарэвіч. У ролях Галі Жураўкі («Пакуль вы маладыя»), Надзеі («Выбух») і асабліва Тацяны («Твой светлы шлях») артыстка кранае шчырасцю пачуццяў, уменнем глыбока пранікнуць у душу сваёй гераіні і выразна паказаць са сцэны нашу маладую сучасніцу.

Добрыя акцёрскія дадзеныя дэманструе артыст Тэатра імя Я. Коласа Г. Гарбук. У створаным ім вобразе маладога беларускага хлопца Юркі ў спектаклі «Лявоніха» многа сапраўднай непасрэднасці і шчырасці, акцёр глыбока раскрывае прыгожую душу сялянскага юнака.

Радасць поспеху ў гледача не раз ужо зведала Г. Маркіна яшчэ ў Тэатры імя ЛКСМ Беларусі, куды яна прыйшла пасля заканчэння Тэатральнага інстытута. Яркае акцёрскае дараванне яна паказала ў ролі Наташы («Вясёлка») і радзе іншых. Зараз у Тэатры імя Якуба Коласа, куды пераявялі актрысу, яна з кожнай новай роллю ўсё больш пашырае свой акцёрскі дыяпазон. Выканаўшы з поспехам складаную ролю Тані Баскакавай («Пачатак жыцця» К. Фіна), Г. Маркіна зараз рыхтуе вельмі цікавы вобраз настаўніцы музыкі Яўгеніі ў новым спектаклі «Выгнанне блудніцы» па п'есе І. Шамякіна.

Удалы дэбют маладой выпускніцы Тэатральнага інстытута Л. Давідовіч у ролі калгаснай дзяўчыны («Твой светлы шлях»). Жыццярадаснасць, жывое пачуццё гумару вельмі ўпрыгожылі вобраз Кацярыны. Гэтую ролю маладая артыстка выконвае з усёй шчырасцю і захапленнем.

К. С. Станіслаўскі гаварыў, што па акцёру можна пазнаць тэатр. Калі мы бачым Л. Цімафееву, П. Дубашынскага, Р. Маленчанку, В. Лебедзева, Б. Барысенка, Л. Барташэвіч, Б. Піскуна — ведаем, што глядзім спектакль Тэатра юнага гледача, хоць бы ён выступаў і не на сваёй сцэне. Хоць ТЮГ — тэатр малады, аднак ён заваёўвае ўсё большую папулярнасць не толькі ў юнага, але і дарослага гледача. І гэта пры той умове, што побач са сталымі акцёрамі на яго сцэне выступае тэатральная моладзь, якая з кожным новым спектаклем усё больш замацоўвае свае пазіцыі.

Нельга ў адным артыкуле ахарактарызаваць усіх здольных маладых акцёраў тэатраў нашай рэспублікі. Аднак нельга хоць бы не ўпамянуць такія яркія творчыя індывідуальнасці, як Г. Ваксман, З. Зубкова, В. Белахвосцік, Г. Аўсянікаў (Тэатр імя Я.Купалы); Л. Куцькіна, Г. Кокшты, Е. Шабан (Тэатр імя Я. Коласа); Э. Аўчыннікава, Ю. Сцяпанаў (Рускі тэатр); Ю. Істомін, Л. Зельцына (Брэст); А. Дударaў (Гомель), Г. Шашкіна (Гродна), Б. Дружкоў (Магілёў), Ю. Саевіч (Бабруйск), Л. Мікула (Тэатр лялек). Гэтыя і многія іншыя маладыя акцёры — тая перспектыва, без якой немагчыма будучыня нашага тэатра.

Калі мы гаворым, што папаўненне тэатраў акцёрскімі кадрамі — важнейшая задача, дык яшчэ больш востра ў тэатрах рэспублікі адчуваецца недахоп рэжысёрскіх кадраў. Мы можам назваць маладых рэжысёраў З. Браварскую, Г. Уладамірскую ў Тэатры імя Янкі Купалы, А. Бяляева ў Тэатры юнага гледача, А. Бутакова ў Тэатральна-мастацкім інстытуце, С. Кохана ў Тэатры імя Якуба Коласа і некаторых іншых, якія займаюцца пераважна асістэнцкай работай. Кіраўніцтва тэатраў вельмі нясмела ідзе на тое, каб даручаць ім самастойныя пастаноўкі. Толькі некаторыя тэатры вылучаюць на спектаклі асістэнтаў-рэжысёраў. А між тым дырэктарам тэатраў, як руплівым гаспадарам, трэба было б думаць аб тым, хто будзе рабіць уводы ў спектаклі, якія ставяць прыезджыя рэжысёры, наглядаць за якасцю паказаў на гастролях і г. д.

Дбаючы аб росце маладых творчых сіл, тэатры часам падыходзяць да справы па-спажывецку: абы задаволіць свае штодзённыя патрэбы. Часам маладому, яшчэ не спрактыкаванаму акцёру раптам даюць з аднойдзвюх рэпетыцый замяніць акцёра, які захварэў, часцей за ўсё маладым акцёрам даручаюць дубліраванне ролей, але не даюць неабходнай колькасці рэпетыцый. У такім выпадку малады акцёр ідзе па лініі найменшага супраціўлення: ён проста капіруе асноўнага выканаўцу, падладжваецца пад яго індывідуальнасць. Вядома, дублёр ніколі не будзе мець дастатковай колькасці рэпетыцый, пакуль не будзе добрай работы рэжысёраў-асістэнтаў і ўважлівага нагляду рэжысёра-пастаноўшчыка.

Пры спрыяльных адносінах старэйшых майстроў да сваёй змены, маладым акцёрам магла б быць аказана вельмі каштоўная дапамога з іх боку. Нішто так не акрыляе маладога выканаўцу, як уважлівая таварыская крытыка іх работы рэжысурай і вядучымі акцёрамі — першымі і самымі высокаўтарытэтнымі іх настаўнікамі. На справе ж мы часцей за ўсё бачым высакамернасць, пагарду да маладых парасткаў. Маўляў, зялёны яшчэ, малако на губах не абсохла, а ўжо на вядучыя ролі імкнецца, на поспех спадзяецца. Ты год пяць у масоўках пахадзі, абатры кулісы, каля мяне пакруціся, а пасля паглядзім — можа з цябе што і выйдзе.

Я не хачу сказаць, што ўсе майстры сцэны так ставяцца да моладзі, аднак, на жаль, мы не маем такіх прыкладаў, як, скажам, Яўсцігней Міровіч, які выхаваў рэжысёраў Л. Рахленку, М. Зорава, Б. Дольскага і інш. А хто з сённяшніх рэжысёраў падрыхтаваў свайго вучня і паслядоўніка?

Трэба па справядлівасці сказаць, што і некаторыя маладыя акцёры не выхавалі ў сябе настойлівасці, жадання штодзённа займацца самаадукацыяй, многа чытаць, хадзіць на лекцыі. Зусім нядаўна на творчай канферэнцыі, дзе выступалі вядомыя тэатральныя дзеячы, апрача студэнтаў Тэатральнага інстытута, якія прыйшлі на нараду ў парадку вучэбнага задання, мы амаль не бачылі тэатральнай моладзі.

Наша тэатральная моладзь жыве ў вельмі шчаслівы час. Аб ёй клапоцяцца, ёй дапамагаюць і ў жыцці і ў вучобе. Калі думаеш пра нашу моладзь, пра тых, хто забяспечвае славу Радзіме на сусветных спартыўных алімпіядах, здзіўляе сваім віртуозным майстэрствам танца, хто заваёўвае любоў народа сваёй адданай працай на сцэне — сэрца напаўняецца радасцю і вераю ў нашу цудоўную моладзь, у яе пачэсную справу.

Яўг. РАМАНОВІЧ.

Мінская студыя тэлебачання паказала літаратурна-драматычную кампазіцыю «Маці» па творах М. Горкага. Аўтар і рэжысёр — М. Пінігін.

На здымку: Маці — заслужаная артыстка БССР **А. Клімава**, Тамерлан—народны артыст БССР **Я. Карнаухаў.**

Фота **Я. Альхімовіча.**

Пародыі

У госці

Па матывах зборніка «Сосны і дзюны» М. Калачынскага

Госцем добра быць на дзіва:
Ні сумненняў, ні трывог.
А табе падносяць піва
І засмажаны гарох,

Па сялянскай новай звычцы
Пададуць на стол пяршак,
Потым выпіляць на скрыпцы
Польку «Янку» і гапак.

З перапоўненае залі
Адвядуць спачыць у цень...
Каб у госці запрашалі,
Я хадзіў бы кожны дзень.

Пахне...

Пахне тупатам ног
П. Макаль.

Пахне тупатам ног,
Перакрэсленым шумам,
Скрыжаваннем дарог,
Скавытаннем і тлумам.

Пахне смехам вятроў,
Пахне месячным пылам
І рыканнем кароў,
І іржаннем кабылы.

Над часопісам

Гэты шум,
які я прыняў усур'ёз.
Нечакана
у рокат цяжкі перарос —
. . . . . .
Значыць, пойдуць шпарчэй
гадунцы нашы ў рост.
Што ні дзень — то дужэй.
Што ні год — прыгажэй.
(М. Арочка, «Сустрэча ў дарозе»).

Я ў дарозе прылёг
пад цяністай сасной.
Несур'ёзны «По — 2»
тарахцеў нада мной.
Каб не слухаць,
часопіс раскрыў я наўгад.
— Толькі ўперад, — чытаю, —
ні кроку назад!
Дзесяць дзён я адказу шукаў —
не знайшоў:
Ці Арочка пісаў,
ці Аркадзь Куляшоў.

Ягор КУДРЫЦКІ.

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНАЙ РАБОЦЕ — ШЫРОКІ РАЗМАХ

Заўсёды ў пошуках

...Люты 1945 года. На захадзе яшчэ грымяць баі, а ў вызваленых ад гітлераўскіх бандытаў раёнах ужо кіпіць мірная стваральная праца, аднаўляецца разбураная і абрабаваная фашыстамі народная гаспадарка.

У гэты час на працу ў Кармянскую раённую бібліятэку прыйшла Ніна Антоненка.

Памяшканне, у якім мясцілася пасля вайны бібліятэка, было не прыстасавана для работы. Невялікі быў у той час і кніжны фонд бібліятэкі — усяго 300 экземпляраў. А працаваць трэба было...

Н. Антоненка арганізавала збор кніг у насельніцтва. У час уборкі збожжавых дзяжурыла на прыёмным пункце і зернескладах, праводзіла з калгаснікамі гутаркі, гучныя чыткі газет, часопісаў, кніг.

І вынікі былі відавочнымі. У бібліятэку ішлі рабочыя, служачыя, вучні, калгаснікі. Многія з іх прыносілі з сабою і перадавалі ў фонд бібліятэкі мастацкую, палітычную, сельскагаспадарчую і іншую літаратуру. Так паступова павялічваўся кніжны фонд раённай бібліятэкі. Гады праз 3—4 ён складаў ужо больш 3 тысяч экземпляраў.

Шаснаццаты год загадвае Ніна Піліпаўна раённай бібліятэкай. За гэты час да непазнавальнасці вырас савецкі чытач. Бібліятэка размясцілася ў прасторным тыпавым цаглянным памяшканні раённага Дома культуры.

У кніжным фондзе яе цяпер каля 50 тысяч тамоў. Абсталявана добрая чытальная зала, арганізаван свабодны доступ да кніг. Пастаянных чытачоў у раённай бібліятэцы — больш 800. Толькі за 11 месяцаў мінулага года чытачам было выдадзена 23 тысячы кніг мастацкай, тэхнічнай, палітычнай, навуковай і іншай літаратуры. Гэта аб многім гаворыць.

Значна дапамагае бібліятэка студэнтам-завочнікам ВНУ. Праз міжбібліятэчны абанемент яна атрымлівае для завочнікаў літаратуру з Гомельскай абласной і рэспубліканскіх бібліятэк.

Цікавая форма прапаганды навуковай, тэхнічнай і іншай літаратуры—вусныя часопісы, якія Кармянская раённая бібліятэка арганізоўвае для чытачоў два разы ў месяц. Напрыклад, у канцы мінулага года быў праведзен вусны часопіс на тэму: «Мы народжаны, каб казку зрабіць явай», прысвечаны запуску штучных спадарожнікаў Зямлі і ракет у бок Месяца. А сёлета былі арганізаваны вусныя часопісы на тэмы савецкага патрыятызму, дружбы і кахання. У стварэнні такіх часопісаў работнікам бібліятэкі дапамагаюць настаўнікі Кармянскай сярэдняй школы № 1 тт. Ваксман, Кац, Касцючэнка, Несцяровіч, сакратар раённага камітэта ЛКСМ Беларусі тав. Міцкевіч, супрацоўнік раённай газеты «Авангард» тав. Петрачэнка і інш.

Раз у месяц праводзяцца канферэнцыі чытачоў. Звычайна перад канферэнцыяй работнікі бібліятэкі наладжваюць калектыўныя чыткі кніг на прадпрыемствах, у калгасах і саўгасах. Напрыклад, перад канферэнцыяй па аповесці Ул. Цендракова «Цудатворная» супрацоўніца бібліятэкі І. Лукомская чытала ўрыўкі з кнігі, знаёміла з яе зместам рабочых тэкстыльнай фабрыкі імя Клары Цэткін. Н. Антоненка падрабязна расказала калгаснікам сельгасарцелі «Перамога» аб рамане Петруся Броўкі «Калі зліваюцца рэкі». З дапамогай актыву раённага Дома культуры, кармянскіх сярэдніх школ №№ 1 і 2, партыйных і камсамольскіх арганізацый бібліятэка наладжвае дыспуты, тэматычныя вечары, літаратурныя віктарыны і іншыя карысныя мерапрыемствы. Цікава прайшлі літаратурныя вечары, прысвечаныя жыццю і творчасці Чэхава, Горкага, Талстога. Адбыўся вечар, прысвечаны абмеркаванню матэрыялаў студзеньскага Пленума ЦК КПСС і Заявы Савецкага ўрада ў сувязі з забойствам Патрыса Лумумбы. З дакладамі выступілі першы сакратар РК КПБ І. Раманаў і Н. Антоненка.

Карысную справу робіць Кармянская раённая бібліятэка. Ва ўсім гэтым немалая заслуга загадчыцы бібліятэкі Ніны Піліпаўны Антоненка, якая заўсёды шукае новыя формы і метады працы.

Ул. ВАСІЛЬЕЎ.

А дзе ж бібліятэка?..

Салігорск! Там, дзе нядаўна было поле, узняўся цудоўны горад. Дамы—вялікія, светлыя. Ёсць клуб, школа. Будуецца кінатэатр.

— А дзе ж ваша гарадская бібліятэка? — пытаемся ў людзей.

— Ды такой тут і не чуваць, — адказвае адзін рабочы. — Катушок ёсць, дык там добрую кнігу днём з агнём не знойдзеш.

Доўга мы шукалі гэтую бібліятэку. Амаль ніхто з жыхароў пра яе не ведаў, ды і шыльды не аказалася на струхнелым бараку.

І вось, нарэшце, мы ў памяшканні. Гэта сапраўды «катушок».

— Тут раней прарабская была, — тлумачаць чытачы.

Замест паліц з кнігамі — некалькі замкнёных шафаў, столік, відавочна, пакінуты ў спадчыну прарабам, ды два кульгавыя крэслы.

— А што ж гэта вы ў паліто вясну палохаеце? — жартуючы, звярнуліся мы да бібліятэкаркі Людмілы Карнілавай.

— Нічога не зробіш. У нас не цяплей, чым на вуліцы.

— А што думае наконт гэтага ваша начальства?

— Ды што начальству! За два гады тут іх нікога і не было, — гаворыць Людміла Карнілава.

Салігорская (па сутнасці, гарадская) бібліятэка падначалена будаўнічаму трэсту № 3. Упраўляючы трэста тав. Кісялёў не спяшаецца прадаставіць бібліятэцы новае памяшканне. Два гады, як на яе паліцах не з'яўляліся навінкі. А калі б вы захацелі прачытаць газеты, скажам, «Известия», «Советскую Белоруссию» ці літаратурна-мастацкі часопіс «Полымя», — у бібліятэцы іх не знойдзеш. Не выпісаны. Сродкі не адпушчаны.

У Салігорску шмат аматараў літаратуры. Паводле бібліятэчных фармуляраў — каля паўтары тысячы чытачоў. Бяда толькі ў тым, што ў шахцёрскім гарадку не клапоцяцца аб задавальненні культурных патрэб.

М. ГАНЧАРОЎ.

Салігорск.

На вопыце лепшых

Нядаўна Гомельскі гарком партыі і гарадскі аддзел культуры правялі чарговую міжведамасную канферэнцыю бібліятэчных работнікаў Гомеля.

Прапагандысты кнігі падвялі вынікі працы за мінулы год, намецілі задачы па дастойнай сустрэчы XXII з'езду КПСС.

Удзельнікі канферэнцыі правялі семінарскія заняткі ў Нова-Беліцкай гарадской бібліятэцы. Асноўная ўвага надавалася пытанням работы бібліятэкі сярод выбаршчыкаў і масавай рабоце з чытачамі па ажыццяўленню рашэнняў студзеньскага Пленума ЦК КПСС.

З канцэртам да выбаршчыкаў

Неўзабаве адбудуцца выбары ў мясцовыя Саветы. Агітбрыгада Капаткевіцкага раённага Дома культуры дала для выбаршчыкаў раёна трыццаць канцэртаў. Па-майстэрску выконвалі нумары самадзейныя артысты Ніла Ягур, Ліда Сцяпук, Люба Антанішына, Іван Харланаў і баяніст Міхаіл Яромін.

Агітбрыгада рыхтуецца да выезду ў Петрыкаўскі раён. Самадзейныя артысты запланавалі наведаць дзесяць населеных пунктаў і даць у іх канцэрты.

П. КУШНЕР.

Мастацтва Беларусі — на экране

Мінская студыя навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных фільмаў пачала выпуск новага кіначасопіса «Мастацтва Беларусі». На экранах дэманструецца першы яго нумар. Часопіс мае на мэце паказваць багатае творчае жыццё рэспублікі, адлюстроўваць дзейнасць як выканаўцаў-прафесіяналаў, так і аматараў, народных умельцаў. Яго перыядычнасць — адзін раз у квартал.

Першы нумар часопіса адкрываецца паказам фрагментаў з новай беларускай оперы «Калючая ружа», знаёміць з яе аўтарамі і выканаўцамі галоўных ролей.

«Тэма, падказаная жыццём» — так называецца чарговы сюжэт, які расказвае пра гісторыю стварэння карціны «Ангара-Ангара» мастаком І. Стасевічам, які не адзін месяц правёў на будоўлі Брацкай ГЭС.

Фрагменты з новай пастаноўкі «Два колеры» Народнага тэатра Дома культуры Віцебскага ўпраўлення мясцовай прамысловасці паказаны ў трэцім сюжэце. Артысты Народнага тэатра — амаль усе дружыннікі і часта проста з дзяжурства ідуць іграць у тэатр. Спектаклем «Два колеры» яны таксама змагаюцца а ценямі мінулага, бо спектакль прысвечаны паказу барацьбы з парушальнікамі і хуліганамі.

Змешчаны і рэпартаж са здымкі «Беларусьфільмам» другой серыі кінатвора па матывах трылогіі Я. Коласа «На ростанях».

Заканчваецца кіначасопіс паказам танца «Лявоніха» ў новай пастаноўцы Беларускага народнага ансамбля песні і танца.

Толькі членам саюза...

ПІСЬМО Ў РЭДАКЦЫЮ

Нашы мастакі-прафесіяналы і тыя, што робяць толькі першыя крокі ў выяўленчым мастацтве, добра ведаюць магазін-салон на праспекце імя Сталіна, бо іменна ў гэтым спецыялізаваным магазіне павінны заўсёды быць неабходныя рэчы для малявання: масляныя фарбы, пэндзлі, картон і г. д. Павінны быць, але там іх, на жаль, амаль што ніколі няма.

Іншы ж раз папросіш, напрыклад, у прадаўшчыцы цюбік цынкавых бялілі, а яна адказвае:

— Бярыце два цюбікі сажы газавай, тады і бялілы атрымаеце...

А пра пэндзлі і казаць не даводзіцца: іх ніколі не купіш у салон-магазіне. І вось аднойчы я заўважыў, як перада мной прадаўшчыца адпусціла аднаму пажылому грамадзяніну фарбы і пэндзаль. Я вельмі ўзрадаваўся ў надзеі, што таксама магу набыць неабходныя для малявання прылады. Але прадаўшчыца мяне адразу ж папярэдзіла:

— Пэндзлі і фарбы ў нас прадаюцца толькі членам Саюза мастакоў...

Чаму?

А. ПЯТРУХНА,
студэнт Мінскага мастацкага вучылішча.

ПА СЛЯДАХ НАШЫХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ

«Неапраўданыя спадзяванні»

Метадыст па спевах Мінскага абласнога інстытута ўдасканалення настаўнікаў тав. І. Папоў у артыкуле, змешчаным у 11 нумары нашай газеты пад такой назвай, узнімаў пытанне аб дрэннай падрыхтоўцы настаўнікаў спеваў.

Кафедра музыкі і спеваў Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага (загадчык І. Ахрыменка) абмеркавала недахопы ў сваёй рабоце, на якія спасылаецца аўтар артыкула, і прыняла захады да іх выпраўлення.

«Над гэтым варта падумаць»

Настаўнік І. Рабкоў у пісьме ў рэдакцыю пад такой назвай, змешчаным у 104 нумары нашай газеты за мінулы год, прапаноўваў змяніць час радыёперадач для дзяцей.

Старшыня Камітэта па радыёвяшчанню і тэлебачанню пры Савеце Міністраў БССР тав. В. Несцяровіч паведаміў, што ў лютым — сакавіку Беларускае радыё пяройдзе на новы расклад вяшчання. І тады асноўныя перадачы для дзяцей і юнацтва будуць весціся з 16.05 да 17 гадзін (штодзённа). А перадачы для дашкольнікаў будуць пачынацца а 10 гадзіне раніцы. Гэта найбольш зручны час як для тых дашкольнікаў, што наведваюць дзіцячыя сады, так і для тых, якія знаходзяцца дома.

ГІСТОРЫЯ БАЙКІ МАЕ ПРАЦЯГ

У апошні час у нашай крытыцы і літаратуразнаўстве ўсё часцей з'яўляюцца працы аб пэўных перыядах літаратурнага развіцця — грунтоўныя, заснаваныя на дэталёвым вывучэнні багатага фактычнага матэрыялу даследаванні спецыфікі мастацкага слова, гісторыі ўзнікнення, станаўлення і развіцця тых ці іншых жанраў, стыляў і г. д.

Прыцягвае ўвагу параўнальна невялікая, але змястоўная праца Янкі Казекі «Беларуская байка»*).

Гэта адна з тых кніг, у якіх дасканалае веданне фактаў гісторыі літаратуры спалучаецца з удумлівым іх асэнсаваннем. Добры эстэтычны густ аўтара, дасціпнасць літаратурна-мастацкага аналізу, тонкае адчуванне слова — такое прыемнае ўражанне ад кнігі.

Праца Я. Казекі ахоплівае гісторыю беларускай байкі ад перыяду яе зараджэння да сённяшняга дня. У першым раздзеле аўтар дае сціслы агляд такіх шырока вядомых сатырычных помнікаў беларускай старажытнай літаратуры, як «Прамова Мялешкі» і «Ліст да Абуховіча», коратка характарызуе некаторыя інтэрмедыі XVII—XVIII ст.ст., разглядае «Уваскрэсенне Хрыстова і сашэсце яго ў ад», аналізуе парадыйна-сатырычныя паэмы «Энеіда навыварат» і «Тарас на Парнасе». Слушна падкрэсліваючы, што «новая беларуская літаратура развівалася на працягу ўсяго XIX стагоддзя пераважна як літаратура сатырычная» і што «амаль усе яе найбольш значныя творы былі насычаны элементамі грамадскай, сацыяльнай сатыры», даследчык зазначае: «Дакастрычніцкая літаратура беларусаў бадай і не ведала чыста дыдактычных баек. Байкі, створаныя Ф. Багушэвічам, А. Абуховічам, а пазней Я. Купалам і Я. Коласам, мелі выразна акрэсленую дэмакратычную накіраванасць і служылі інтарэсам барацьбы супраць царызму, за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне народа».

Звяртаючыся непасрэдна да творчасці Ф. Багушэвіча і А. Абуховіча, Я. Казека падрабязна аналізуе перакладныя і арыгінальныя байкі гэтых пісьменнікаў-дэмакратаў. Ён паказвае, што першыя не з'яўляюцца перакладамі ў поўным сэнсе слова. Яны і не «пералажэнні»-пераробкі накшталт тых, якія рабіла ў свой час беларуская пісьменніца-этнограф Марыя Косіч, прыстасоўваючы крылоўскія байкі да адпаведных мясцовых з'яў. Слабыя, часам нават прымітыўныя ў мастацкіх адносінах «пералажэнні» М. Косіч, заўважае аўтар, пазбаўлялі творы Крылова «вострай грамадскай накіраванасці і сатырычнай сілы».

Ф. Багушэвіч і А. Абуховіч на аснове крылоўскіх баечных сюжэтаў «стваралі па сутнасці самабытныя байкі, надаўшы ім выразны беларускі каларыт».

Абгрунтоўваючы думку аб самабытнасці баек Багушэвіча і Абуховіча, напісаных па матывах Крылова, даследчык не толькі супастаўляе адпаведныя рускія і беларускія творы, але і спасылаецца на вопыт сусветнай літаратуры, якая ведае нямала выпадкаў, калі на аснове аднаго распаўсюджанага баечнага сюжэта ствараўся шэраг па-свойму выдатных, арыгінальных баек. Гэта тлумачыцца, падкрэслівае аўтар, самой прыродай байкі як жанра, аб асаблівасцях якой трапна сказаў яшчэ А. Патэбня.

У байцы «абагульненне прыватнага выпадку, — пісаў ён, — можа ісці да найвышэйшай ступені. Байка... нагадвае кропку, праз якую можна правесці бясконцую колькасць ліній. Толькі дастасаванне байкі да прыватнага выпадку вызначае, якія з яе рысаў захаваны ў абагульненні, калі гэта абагульненне павінна захаваць сувязь з самой байкай».

Адсюль, зразумела, не вынікае, што звычайна баечныя сюжэты не маюць сваіх глыбокіх карэнняў у нацыянальным жыцці кожнага народа. Я. Казека звяртае ўвагу на тое, што, напрыклад, байкі «Воўк і авечка» Ф. Багушэвіча або «Ваўкалак» А. Абуховіча, як і іншыя іх творы, моцна звязаны з беларускім фальклорам, у прыватнасці з народнай сатырычнай песняй, сатырычнай казкай, з беларускімі прыказкамі і пагаворкамі. Непасрэдна з народнай прыказкі вырасла байка малавядомага пісьменніка Лявона Вітэн-Дубяйкоўскага «Цягне воўк — пацягнуць воўка», якая з'яўляецца ілюстрацыяй да адпаведнай прыказкі.

Сувязь лепшых беларускіх баек XIX ст. з народнай творчасцю давала ім сілу, у значнай ступені абумоўлівала рэалістычнасць іх зместу.

Гэтай сувязі з фальклорам не парывала і пазнейшая беларуская байка, у асаблівасці баечная творчасць Янкі Купалы і Якуба Коласа, якая ўпершыню ў нашым літаратуразнаўстве так падрабязна і грунтоўна вывучаецца ў кнізе Янкі Казекі. Вастрыня і трапнасць сатыры, прасякнутай «гарачым пачуццём нацыянальнай і чалавечай годнасці беларуса», гранічная выразнасць і канкрэтнасць алегорыі, непрыйманне надакучлівай маралізацыі, акрэсленасць, пэўнасць грамадскіх і палітычных крытэрыяў, памфлетнасць, сувязь з жыццём народа — усе гэтыя і некаторыя іншыя асаблівасці купалаўскай байкі глыбока вытлумачаны ў даследаванні. Аўтар піша аб далейшым развіцці Я. Купалам, Я. Коласам і часткова М. Багдановічам беларускага баечнага верша, падкрэслівае, што ў народных паэтаў Беларусі «байка стала жанрам палітычнай сатыры, жанрам рэалістычнага адлюстравання жыцця, рэвалюцыйных поглядаў і імкненняў народа». На традыцыях купалаўскай і коласаўскай байкі, прадаўжае даследчык, «вырасла пазней непаўторная, глыбока самабытная баечная творчасць Кандрата Крапівы», аналізу якой прысвечаны спецыяльны раздзел кнігі.

Разглядаючы байкі К. Крапівы як вышэйшае дасягненне беларускага мастацкага слова ў гэтым жанры, Я. Казека з поўнай падставай гаворыць пра прынцова важнае для ўсёй савецкай літаратуры наватарства пісьменніка ў галіне сатыры, якое дазволіла яму ўнесці значны ўклад у развіццё сусветнай байкі. Нездарма творчасць старэйшага беларускага байкапісца звяртае на сябе пільную ўвагу не толькі савецкіх, але і зарубежных літаратуразнаўцаў. Даследчык цытуе цікавае выказванне чэшскага вучонага І. Румлера, які бачыць вызначальную асаблівасць байкі Крапівы ў тым, што яна адкідвае просталінейную дыдактыку, натуральна спалучае ў сабе апавядальныя, драматычныя, сатырычныя і лірычныя элементы. Пацвярджаючы гэтую думку канкрэтным аналізам твораў пісьменніка, Я. Казека зазначае, што К. Крапіва, удасканальваючы байку, зрабіў яе жанрам публіцыстычна завостранай сатыры. Побач з гэтым аўтар не адмаўляе і таго бясспрэчнага факту, што пісьменнік «дбайна збярог і традыцыйныя ўласцівасці, традыцыйныя адзнакі баечнага жанра».

Творчасць К. Крапівы сапраўды ўвабрала як беларускія нацыянальна-фальклорныя традыцыі, так і літаратурныя традыцыі сусветнай байкі.

Апошняя акалічнасць, вядома ее перашкаджае творам байкапісца быць народнымі. «Яны, — чытаем у кнізе Я. Казекі, — цалкам выраслі з жыцця,

Пры Слуцкім гарадскім Савеце дэпутатаў працоўных пачаў працаваць пазаштатны аддзел культуры. Створаны чатыры секцыі: прапаганды і масава-палітычнай работы, мастацкай самадзейнасці, бібліятэчнай работы і кіно. Яны займаюцца вывучэннем і арганізацыяй культурна-масавых мерапрыемстваў і лекцыйнай прапаганды на прадпрыемствах горада, падрыхтоўкай вечароў пераможцаў сацыялістычнага спаборніцтва, арганізацыяй канферэнцый чытачоў, дапамагаюць наладзіць работу калектывам мастацкай самадзейнасці.

На здымку: загадчыца пазаштатнага аддзела культуры дырэктар Слуцкага Дома піянераў Марыя Сафронаўна **Гаўрылкіна** і члены аддзела пенсіянеры Панфіл Емяльянавіч **Бераснёў** і Аляксей Віктаравіч **Дзямідаў**.

Фота **П. Наватарава.**
Фотахроніка БЕЛТА.

ПОПЕЛ І КРОЎ СТУКАЮЦЬ У СЭРЦЫ НАШЫ

У народа не кароткая памяць, і той, хто запырскаў рукі крывёй чалавечай, няхай запомніць, што кроў людская—не вадзіца і плямы ад яе не прасохнуць і не змыюцца, няхай не спадзяецца, што за «даўнасцю часу» ўсё забудзецца і яго абміне святая народная кара.

Попел спаленых у печах Асвенціма, кроў расстраляных, закатаваных і павешаных у шматлікіх лагерах смерці, зажыва спаленых у беларускіх вёсках, жыўцом пахаваных у незлічоных магілах, што раскіданы па ўсёй вялічэзнай тэрыторыі, якая была акупіравана фашыстамі, стукае ў сэрцы жывых, не дае і не дасць ім спакою, пакуль па зямлі будзе хадзіць хоць адзін кат. Тым, хто чыніў нечуваныя зверствы над старымі і малымі, хто з абыякавасцю прафесіянальнага забойцы страляў у патыліцу дзіцяці і бабульцы, ніхто і ніколі не даруе.

Судовы працэс, што адбыўся ў сталіцы Эстонскай ССР Таліне, і адбываецца ў Рызе над вылюдкамі рода чалавечага, — гэта не прыватныя судовыя даследаванні. Усе добрасумленныя людзі свету глядзяць на іх, як на судовыя праследванні не толькі чорных пачвар мінулага, але і як на выкрыццё і пакаранне тых, хто там, за межамі сацыялістычнага свету, выношвае вар'яцкія планы заняволення цэлых народаў і кантынентаў. Няхай не прыкідваюцца імперыялістычныя драпежнікі рахманымі авечкамі, няхай не строяць з сябе міратворцаў і дабрачынцаў свету. Народы ведаюць, на што здольны гэтыя дабрачынцы. Гэта ж яны, а не хто іншы, вінаваты ў крывавай трагедыі кангалезскага народа, гэта яны, а не хто іншы, забілі гераічнага сына Афрыкі Патрыса Лумумбу і яго паплечнікаў. Гэта яны імкнуцца наладзіць крывавы баль у Лаосе. Гэта яны замахваюцца на свабоду Кубы. Гэта яны, чапляючыся за спарахнелае рыззё мінулага, хочуць спыніць няўхільны працэс разняволення каланіяльных народаў. Гэта іх эмісар Даг Хамаршэльд, маскіруючыся пад міратворца, гатовы чацвертаваць цэлыя народы за іх імкненне вызваліцца з пут каланіялізму. Гэта яны сёння абяляюць і ўслаўляюць тых, хто ўчора катаваў народы, гэта яны шукаюць формул і фармулёвак, пры дапамозе якіх можна было б давесці, што Гітлер не быў Гітлерам, што фашызм гэта не фашызм, а святы агнец, які ў сілу склаўшыхся прычын вымушаны быў праліваць людскую кроў. Інакш чым жа растлумачыць тое, што англійскія ўлады не толькі не выдалі правасуддзю оберштурмбанфюрара СД, оберката Айні Мерэ, які сваімі рукамі чыніў крывавыя расправы над тысячамі эстонцаў, рускіх, чэхаў, яўрэяў, англічан, французаў, але і выстаўляюць яго, як святога пакутніка, «змагара за свабоду эстонскага народа». І колькі б ні пнуліся англійскія патэнцыяльныя каты давесці святую нявіннасць Айні Мерэ, нашы савецкія людзі ведаюць, яны не забылі за «даўнасцю часу» ні лагера «Ягала», ні напоеных крывёю ўзгоркаў Калевы-Лійва, ні чорных прывідаў смерці ў Клаога, Вільяндзі, Нарве, Тарту.

Былы вязень Канстанцін Лехе, рабочы з горада Пярну, які прапакутваў у лагерах больш трох год, расказаў не толькі эстонцам, але і людзям усяго свету, якімі «змагарамі за свабоду эстонскага народа» з'яўляюцца Айні Мерэ і яго паплечнікі Лаак, Гетрэс, якім вынесен суровы прыгавор, і тыя, што сёння не сядзяць на лаве падсудных, але пясцяць надзею пры зручным моманце напіцца ўдосталь крыві чалавечай.

Нам, беларусам, асабліва балюча чытаць радкі справаздачы аб судовым працэсе ў Рызе. Дзевяць фашысцкіх галаварэзаў, якія сёння прадсталі перад Вярхоўным судом Латвійскай ССР: Яніс Бумберс, Франц Лемяшонак-Эглайс, Вальдэмар Огрыньш, Освальекаб Лапіньш, Эрнест Вілніс, Яўген Лусіс, Эдуард Шкетэрыс, Вальдэмар Шырмахер, Язэп Зламентс, вяршылі свае крывавыя справы і на тэрыторыі нашай рэспублікі. Гэта яны складалі ядро 18-га паліцэйскага батальёна, які ў маі 1942 г. быў перакінуты ў Беларусь для барацьбы з партызанамі. Гэта яны, карнікі з атрада Бумберса, 29 чэрвеня 1942 г. з'явіліся на хутар Ціхі Карэліцкага раёна ў дом Аляксандра Калесніка, спалілі яго, а жыхароў хутара Пятра Гуліцкага, Леаніда Варановіча і Фёдара Тулейку забілі. Гэта яны, фашысцкія прыхвасні, у вёсцы Вяда Брэсцкай вобласці расстралялі да 400 жыхароў і спалілі 80 дамоў. П'яныя людской крывёю, на другі дзень яны знішчылі амаль усё насельніцтва вёскі Тупічычы. Вёску Бабровічы, у якой было 165 двароў, галаварэзы спалілі і знішчылі нашчэнт. Ніводнаму жыхару гэтай вёскі не ўдалося выратавацца. Мо' людаеды ў Бабровічах стараліся так таму, што ў іх акцыі ўдзельнічаў гітлераўскі генерал Екельн. А як вядома, кожны ж сабака, нават шалёны, стараецца выслужыцца перад гаспадаром.

Можна амаль бясконца расказваць пра тыя злачынствы, якія ўчынілі на тэрыторыі нашай рэспублікі фашысцкія цемрашалы Бумберса. Можна было б паведаміць, як былі сцёрты з зямлі вёскі Лугі, Пузічы, Хорастава, можна было б расказаць пра крывавую оргію ў раёне Азерска, пра масавае знішчэнне яўрэйскага насельніцтва ў горадзе Слоніме.

Два дні чыталася ў зале Вярхоўнага Суда Латвійскай ССР абвінаваўчае заключэнне па справе фашысцкіх галаварэзаў. Два дні людзі слухалі тое, ад чаго ў іх жылах ледзянела кроў. Па справе выклікана 80 сведак. Большасць іх з Беларусі. Працэс працягнецца да канца сакавіка. Паказанні сведак дамалююць тую жахлівую карціну, якая з новай сілай раскрые ўсяму свету сутнасць фашызму, яго ідэалогіі, яго крывавай практыкі. Самі па сабе падсудныя — гэта ўжо не такія фігуры, на якіх варта канцэнтраваць увагу чалавецтва. Гэта вылюдкі эстонскага і латышскага народаў. Але на лаве падсудных мы ўяўляем і тых, хто чыніць крывавыя расправы над свабодалюбівымі народамі Афрыкі. На лаве падсудных невідочна сядзяць і тыя, хто сёння адраджае фашызм і чалавеканенавісніцтва ў Заходняй Германіі, хто імкнецца даць у рукі рэваншыстаў ядзерную зброю, хто, забыўшыся на ўрокі гісторыі, прадастаўляе на сваёй тэрыторыі базы для нямецкага вермахта; хто, імкнучыся як мага больш загрэбсці ў свае бяздонныя кішэні долараў, гандлюе сёння зброяй, сумленнем, спакоем і мірам чалавецтва.

Няхай задумаюцца зброяносцы новых авантур над лёсам тых, каго сёння судзяць народы. Можа яны ўбачаць у іхнім і свой будучы лёс і адумаюцца.

У народаў добрая памяць, у іх пільны зрок. Яны ўсё ўгледзяць і нікому ніколі не даруюць ніякага, ні тайнага, ні яўнага, злачынства супраць чалавецтва, супраць спакою і міру на зямлі.

Раман САБАЛЕНКА.

Сустрэчы з чытачамі

На Мінскім трактарным заводзе адбылося выступленне пісьменнікаў, прысвечанае памяці Тараса Шаўчэнкі. Аб творчасці і жыцці вялікага Кабзара расказаў Рыгор Няхай. З чытаннем сваіх твораў выступілі ўкраінскі паэт Тэрэнь Масэнка, латышскі паэт і драматург Фрыцыс Ракпелніс і паэт Пятро Прыходзька.

* * *

У палітэхнікуме днямі сабралася моладзь Варашылаўскага раёна Мінска на сустрэчу з пісьменнікамі-сатырыкамі. Аб рабоце часопіса «Вожык» расказаў Павел Кавалёў. Прачыталі свае творы А. Бялевіч, А. Зарыцкі, М. Пянкрат, І. Сіпакоў, А. Лазнявой.

* * *

У воінаў адной з воінскіх часцей днямі выступілі пісьменнікі П. Кавалёў, А. Русак і С. Шушкевіч, якія прачыталі творы, прысвечаныя гераічным справам і подзвігам байцоў Савецкай Арміі.

Выданне помнікаў беларускай пісьменнасці

Выйшаў у свет першы том хрэстаматыі па гісторыі беларускай мовы, у якім змешчаны тэксты помнікаў старажытнай і старажытнабеларускай моваў. У хрэстаматыі, якая выдаецца ўпершыню ў гісторыі беларускага мовазнаўства, публікуецца 19 невядомых рукапісаў, выяўленых у розных архівах навуковымі работнікамі Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа.

Цяпер у друку знаходзіцца другі том хрэстаматыі, які ахоплівае перыяд з XIX па XX стагоддзе.

САМАТУЖНЫМ СПОСАБАМ

ЯК ВЫПУСКАЮЦЦА І ПРАПАГАНДУЮЦЦА ТВОРЫ БЕЛАРУСКАЙ МУЗЫКІ

З кожным годам пашыраецца сетка музычных навучальных устаноў рэспублікі, нараджаюцца ўсё новыя самадзейныя хоры, вакальныя ансамблі, інструментальныя гурткі аматараў. Таму і попыт на нацыянальны рэпертуар непамерна расце. Пераканацца ў гэтым не цяжка — дастаткова пабываць у якім-небудзь кніжным ці ў нотна-музычным магазіне Мінска.

— Ці няма ў вас «Самавучыцеля ігры на фартэпіяна»? А «Сальфеджыо» Алоўнікава і «Фартэпіянныя эцюды» Чэрні яшчэ не паступалі ў продаж?

— Падбярыце, калі ласка, што-небудзь з апошніх навінак беларускай харавой музыкі...

Такія пытанні і просьбы можна пачуць ад шматлікіх пакупнікоў — аматараў мастацтва і прафесіяналаў. І калі прадавец, бездапаможна разводзячы рукамі, адказвае, што тыя ці іншыя песні, хоры, фартэпіянныя п'есы яшчэ не выйшлі з друку і наўрад ці хутка з'явяцца на магазінных паліцах, расчараваныя пакупнікі, не стрымаўшы сябе, кідаюць гнеўную рэпліку:

— Чым жа займаецца наша выдавецтва?

Многім зусім няўцям, што ў нашай рэспубліцы не існуе свайго музычнага выдавецтва і выпускам твораў беларускіх кампазітараў займаецца Белдзяржвыдавецтва. Тры — чатыры гады назад, уся музычная прадукцыя праходзіла праз рукі адзінага музычнага рэдактара, які выконваў абавязкі і перапісчыка нот, і карэктара. Пра якія ўжо тут якасць і графік выхаду ў свет нотных выданняў можна было весці гаворку?

Зараз музычную рэдакцыю Белдзяржвыдавецтва ўзначалілі кампазітары Д. Камінскі і І. Кузняцоў. Яны, з запалам узяліся за справу. Па ініцыятыве І. Кузняцова зроблены спецыяльныя штампы, каб хоць як-небудзь паскорыць працэс перапіскі музычных твораў перад адпраўкаю іх у друкарню. Вядома, дамагчыся высокіх вынікаў па выпуску нотнай прадукцыі па-ранейшаму немагчыма. На перапіску толькі адной нотнай старонкі ідзе... цэлы дзень. Але гэта яшчэ не асноўная бяда і не самая вялікая перашкода, што стаіць на шляху выдання музычнай літаратуры. Нярэдка яе выхад у свет затрымліваецца па віне друкарні імя Сталіна, якая вельмі неахвотна і без грамадскай зацікаўленасці бярэцца друкаваць ноты.

— Ці многа за апошні час выдалі новых твораў? — спыталі мы аднойчы І. Кузняцова.

— Ніводнага! З ліпеня перапісаныя і падрыхтаваныя для здачы ў вытворчасць нотныя лісты ляжаць нерухома. Кіраўніцтва друкарні імя Сталіна адмовілася іх друкаваць. Гаворыць, што нявыгадна: вельмі малыя тыражы.

І. Кузняцоў хваляваўся нездарма: план выдання музычнай літаратуры за 1960 г. быў пад пагрозай зрыву. І вось тое, чаго так баяліся работнікі выдавецтва, адбылося: палавіна нотнай прадукцыі не паступіла ў кнігагандлёвыя арганізацыі. 21 назва, у тым ліку зборнік песень самадзейных кампазітараў «Роднае Палессе», хоры і вакальныя творы Ул. Алоўнікава, Р. Пукста, А. Туранкова, хрэстаматыя па беларускай музыцы (другая частка) і іншыя патрэбныя і карысныя выданні, своечасова не запушчаныя ў масавую вытворчасць, механічна перайшлі ў тэматычны план 1961 г.

Трэба сказаць, што план выпуску музычных твораў яшчэ адстае ад патрабаванняў жыцця. Наўрад ці была неабходнасць выдаваць партытуры буйных сімфанічных твораў («Сімфаньету» і «Танцавальную сюіту» М. Аладава, Другую сімфонію Р. Пукста), затрачваць на іх вялікія сродкі і працу. Бо гэтыя партытуры цяпер пыляцца на паліцах магазінаў, не маючы ніякага попыту ў масавага пакупніка.

Народ жа чакае выдання новых беларускіх песень і хораў, новых нескладаных партытур для народных і духавых аркестраў. Скажам, выпушчаныя ў мінулым годзе П'есы для цымбал Д. Камінскага, «Полька» і «Марш» для духавога аркестра — гэта патрэбны рэпертуар для нашай мастацкай самадзейнасці, які знойдзе месца ў любой канцэртнай праграме. Можна выдаваць і найбольш папулярныя выбраныя рамансы, арыі з опер беларускіх кампазітараў, але абавязкова па асобных галасах (для сапрана, тэнара і барытона).

У нашай рэспубліцы да найбольш знамянальных дат і падзей, да ўсенародных свят праводзяцца конкурсы на лепшую песню. Такі конкурс быў праведзен і ў гонар саракагоддзя Беларускай ССР. Пасля падвядзення вынікаў было вырашана лепшыя песні выдаць асобным зборнікам — «Пяе наша радасць». Пакуль гэты зборнік рэдагавалі, старанна перапісвалі, а потым друкавалі,—прайшло больш года. І, зразумела, многія песні цяпер ужо страцілі сваю актуальнасць.

А чаму б нашаму выдавецтву не выдаваць масавыя песні беларускіх кампазітараў невялікімі лістоўкамі, як гэта рабілася ў рэспубліцы ў 30-я гады, і тыражом не ў тысячу экземпляраў, а ў 10 тысяч і нават больш? Тады, напэўна, такія танныя ноты-лістоўкі ахвотна і хутка раскупяць — і песні пойдуць у народ.

Музычныя навучальныя ўстановы (школы, вучылішчы), музычныя студыі адчуваюць вострую патрэбу ў педагагічнай літаратуры. Але, на жаль, выдавецтва пакуль не можа наладзіць масавы яе выпуск. А для гэтага ж патрэбна зусім нямногае: павялічыць штат штампоўшчыц да дзесяці чалавек, перавёўшы іх на здзельную аплату працы, і заключыць дагавор з Паліграфічным камбінатам імя Я. Коласа на друкаванне музычна-педагагічнай літаратуры. Яна будзе выходзіць тысячнымі тыражамі, поўнасцю сябе акупіць і пакрые ўсе страты па астатняй нотнай прадукцыі. А галоўнае — шматлікія навучэнцы музычных школ і юныя аматары музыкі, якія займаюцца пры студыях у агульнаадукацыйных школах, атрымаюць неабходныя падручнікі і рэпертуар.

Як жа прапагандуюцца і распаўсюджваюцца ўжо выдадзеныя песенныя зборнікі беларускіх аўтараў, ці даходзяць яны да глыбінных раёнаў? Пакуль што вельмі дрэнна. Нямала нотнай прадукцыі асядае на складах і базах, не трапляючы ў магазіны раённых цэнтраў. Вы не знойдзеце твораў беларускай музыкі ў Тураве, Івянцы, Лельчыцах. Мала гэтых выданняў завозіцца і ў абласныя цэнтры. У мінулым годзе Рэспубліканскі Дом народнай творчасці атрымаў мноства пісем ад кіраўнікоў самадзейных калектываў з просьбай перапісаць і выслаць накладной платай тыя ці іншыя песні і хоры беларускіх кампазітараў. Так, мастацкі кіраўнік Воранаўскага Дома культуры т. Юхноўскі просіць даслаць «Партызанскія акопы» Р. Пукста і «У садочку май» Я. Цікоцкага. М. Літвіновіч з Лунінецкага раёна цікавіцца песнямі «Беларуская застольная» П. Падкавырава і «Прывітальная Маскве» П. Шыдлоўскага. Хармайстар Е. Фёдараў (Барысаў) хацеў бы атрымаць «Майскі вальс» П. Падкавырава і вядомую песню Ул. Алоўнікава «Па-над лесам». Многія з памянёных вакальных твораў ў свой час выйшлі асобнымі выданнямі або ўключаліся ў рэпертуарныя зборнікі. Але, відаць, з-за някемлівасці гандлёвых работнікаў гэтыя песні так і не трапілі ў продаж і ляжаць дзе-небудзь на складах.

Існуючая сістэма заказаў на музычную літаратуру непасрэдна праз кнігагандлі даўно ўжо сябе не апраўдвае. Нельга спадзявацца на асабісты густ адных таваразнаўцаў і прадаўцоў пры афармленні гэтых заказаў. Трэба **арганізоўваць** падпіску на музычныя выданні з дапамогаю работнікаў музычных навучальных устаноў, дамоў народнай творчасці і раённых дамоў культуры пры ўдзеле, вядома, і гандлёвых работнікаў. Тады тыражы на музычную літаратуру значна ўзнімуцца, яна стане ў большай колькасці паступаць у магазіны сельскай мясцовасці. Хіба можна мірыцца са становішчам, калі Белкаапсаюз заказвае... 200 экземпляраў нот, у той час як на вёсцы ёсць вялікая армія народных талентаў, аматараў музыкі.

Каб людзі не ездзілі па новыя песні ў Мінск і не прасілі рэпертуару ў Рэспубліканскага Дома народнай творчасці, трэба наладзіць шырокі продаж нот на вёсцы. Міністэрству культуры БССР і Белдзяржвыдавецтву наспеў час падумаць над усебаковым паляпшэннем дзейнасці музычнай рэдакцыі, устанавіць цесныя творчыя кантакты з друкарняй, каб выпускаць нотную прадукцыю хутка і высакаякасна.

Г. ЗАГАРОДНІ.

Ілья ГУРСКІ

„Не выйдзе, панове!“

Ілья Гурскі працуе над вялікім эпічным творам аб Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Беларусі. Закончана праца над другой кнігай — «Улада Саветам», у якой адлюстроўваюцца рэвалюцыйныя падзеі ў Петраградзе і ў Мінску, барацьба партыі бальшавікоў на чале з Ул. І. Леніным за хутчэйшае заключэнне Брэсцкага мірнага дагавору. У рамане выкрываецца контрэвалюцыйная роля беларускіх нацыяналістаў, якія са згоды і адабрэння імператара Вільгельма II стварылі так званую Беларускую Народную Раду. Дзейнасць нацыяналістаў была варожая інтарэсам працоўных мас. Народ ішоў за ленінскай партыяй, пад яе кіраўніцтвам змагаўся ён за справу рэвалюцыі, за новы лад жыцця.

Друкуем урывак з другой кнігі рамана.

З прыходам кайзераўскіх войск у Мінск актывізавалі сваю дзейнасць усе буржуазныя партыі і асабліва так званая Беларуская Сацыялістычная Грамада. Зблакіраваўшыся з эсэрамі пры падтрымцы бундаўцаў, грамадаўцы, па ўзору Украінскай Народнай Рады, наважылі стварыць урад Беларускай Народнай Рэспублікі. Пры ўрадзе Украінскай Народнай Рады нават быў нямецкі пасол, з якім грамадаўцы імкнуліся ўстанавіць сувязь, каб дабіцца падтрымкі для дасягнення пастаўленай імі мэты.

За тыя некалькі дзён, што немцы былі ў горадзе, яго аблічча зусім змянілася. Афіцэры рускай арміі, якіх раней не было відаць, зараз, пачапіўшы пагоны, шпацыравалі па Захараўскай вуліцы, каля іх круціліся жанчыны, прыемныя ва ўсіх адносінах. Рускія афіцэры аддавалі чэсць нямецкім афіцэрам, якія ў сваю чаргу пагардліва бралі пад казырок, імітуючы прывітанне. Нямецкія салдаты стараліся не заўважаць рускіх афіцэраў, каб не аддаваць чэсці.

На вуліцах з'явіліся самаздаволеныя і самаўпэўненыя людзі ў дарагіх паліто і ў футрах — фабрыканты і памешчыкі, гандляры і свяшчэнаслужыцелі, былыя вышэйшыя чыноўнікі; на іх тварах можна было прачытаць: мы жылі і жыць будзем. Калоцячыся ад холаду, туляліся на панадворках абшарпаныя і замурзаныя дзеці; адны запрашалі пачысціць абутак, другія прапанавалі купіць папяросы і запалкі, трэція выпрошвалі міласціну. Міма праходзіў увесь гэты чорны зброд, нават не заўважаючы іх.

Яшчэ да прыходу немцаў грамадаўцы заварушыліся. Яны прызначылі палкоўніка Косць Езавітава камендантам горада, абавязаўшы яго распачаць стварэнне беларускага войска. У камендатуры пасадзілі некалькі пісараў, якія паставіўшы на сталах папяровыя бела-чырвона-белыя сцяжкі, праводзілі запіс у 1-шы беларускі полк. Нягледзячы на разгорнутую грамадаўцамі, эсэрамі і бундаўцамі работу сярод салдат у казармах, на вакзалах і ў гарадскім эвакапункце, жадаючых запісацца ў беларускае войска было мала. Усё ж знаходзіліся адзінкі, якія гатовы былі хоць чорту служыць, абы іх кармілі і апраналі; але паколькі запасы ў каменданта горада былі абмежаваныя, выкарыстаўшы іх, салдаты разбягаліся. Заставаліся толькі тыя, каму не было куды падацца.

Праз некалькі дзён пасля таго, як прыйшлі немцы, камандуючы фронта генерал Фалькенгайн прызначыў каменданта горада штабнога афіцэра палкоўніка Бюхнера, які, з'явіўшыся ў камендатуру, загадаў зняць бела-чырвона-белы сцяг, што вісеў на доме, і аслабаніць памяшканне каменданту.

— Я пратэстую!—Круглы твар Езавітава наліўся чырванню. — Мяне прызначыў камендантам Народны Сакратарыят Беларускай Народнай Рэспублікі.

— І Народнаму Сакратарыяту Беларускай Народнай Рэспублікі прыдзецца вызваліць памяшканне, якое ён займае, — захоўваючы на тонкіх вуснах ухмылку, прагаварыў Бюхнер.

— Што ж, падпарадкуюся сіле, — працадзіў праз зубы Езавітаў.

— Загадчык спраў Народнага Сакратарыята Заяц папярэджан аб гэтым, — прадаўжаў Бюхнер, пакручваючы пярсцёнкі на пальцах. — Скажце яму, каб паспяшаўся ачысціць памяшканне.

Езавітаў нічога не адказаў, ён, спяшаючыся, вымаў паперы са стала. У яго ад злосці раздзіміліся ноздры, бліскалі вочы і сціскаліся рукі ў кулакі. Але зрабіць нічога не мог.

Бюхнер кіўнуў салдатам, і яны на чале з малодшым афіцэрам сталі наводзіць парадак у памяшканні камендатуры. Замест знятай са сцяны «Пагоні», герба Народнага Сакратарыята Беларускай Народнай Рэспублікі, салдаты павесілі партрэт кайзера Вільгельма II ва ўвесь рост.

Нядоўга пакрасаваўся Езавітаў, пабыўшы камендантам. Не ўдалося яму ні навесці парадку ў горадзе, ні стварыць беларускага войска. Засталіся вернымі Народнаму Сакратарыяту толькі некалькі салдат. І тых не было чым карміць, яны літаральна галадалі.

Народны Сакратарыят таксама вытурылі з памяшкання, якое ён займаў. Да фон Пільца, акупацыйнага губернатара Беларусі хадзіла дэлегацыя з пратэстам, але з гэтага нічога не вышла.

— Я не ўмешваюся ў распараджэнні ваенных,— сказаў фон Пільц.

— Тады мы пойдзем да генерала Фалькенгайна.

— Не раю. Генерал Фалькенгайн сваіх загадаў не адмяняе.

— Мы будзем пісаць паслу пры Украінскай Народнай Радзе.

— Дарэмна. Дзеянні пасла на Беларусь не распаўсюджваюцца. А ў Берлін дакладваць ён не стане. Гэта таксама было б умяшаннем у вайсковыя справы.

— Што ж нам рабіць?

— Трэба заслужыць прыхільнасць вайскоўцаў,— цынічна заявіў фон Пільц.

— Мы стараемся гэта рабіць, — гаварыў Заяц.

— Дрэнна, дрэнна, — ускочыў з-за стала фон Пільц і захадзіў па пакоі. — Вы, як зайцы, у кусты падаліся. Бальшавікі падпольна друкуюць лістоўкі і распаўсюджваюць сярод мясцовага насельніцтва і салдат. Гэта дэмаралізуе войскі. Генерал Фалькенгайн нават дапускае думку, што вы спачуваеце гэтаму. Для вас — чым горш, тым лепш. Спадзяецеся, калі нямецкая ваенная машына забуксуе, тады вы захопіце ўладу. Але без дапамогі немцаў вам ніколі не прыйсці да ўлады.

Дэлегаты прыціхлі.

— Так, так, — злаваў фон Пільц. — Ну, што вы з сябе ўяўляеце? Ваш палкоўнік Езавітаў нават не здолеў арганізаваць полк салдат.

— У нас няма ніякіх сродкаў, — адважыўся ўставіць адзін з дэлегатаў. — Каб нам пазыку?

— Пазыку?! — іранізаваў фон Пільц. — У вас пад носам арудуе пакінуты Мясніковым бальшавік Галуза, а вы робіце выгляд, што яго не заўважаеце.

— Галуза? — выцягнуў шыю Заяц. — Ён тут?

— Тут, тут, — наступаў фон Пільц. — Падпольны Мінскі Камітэт бальшавікоў, які ён узначальвае, па ўсёй Беларусі стварае партызанскія атрады, якія пачынаюць даваць аб сабе знаць. У нас ёсць падазрэнне, што ён дзейнічае за адно з лібкнехтаўцамі, якія, на жаль, ёсць у нашай арміі.

— Каб Галуза нам на вочы патрапіў, дык мы жывым яго не выпусцілі б, — гаварыў Заяц.

— Каб вам на вочы патрапіў?! — ужо крычаў фон Пільц. — Чаго захацелі! Не такі ён прастак, як вам гэтага хацелася. Трэба яго высачыць...

— Пастараемся, — абяцаў Заяц.

— Тады можна будзе весці гаворку пра пазыку, — фон Пільц крыху заспакоіўся, ён падыйшоў да стала і сеў у крэсла. — Магчыма, прыдзецца арганізаваць беларускае войска для барацьбы з партызанамі. Ці гатовы вы да гэтага?

— Трэба абсэймаваць, — сказаў адзін з дэлегатаў.

— Пакуль вы будзеце сэймаваць, партызаны за горла схопяць,—выказаў незадавальненне фон Пільц. Ён паглядзеў на гадзіннік і ўстаў, даючы зразумець, што прыём скончаны.

Дэлегаты паўскаквалі з месц.

— Мы даложым Народнаму Сакратарыяту аб вашых прапановах. — запэўніў Заяц.

Фон Пільц з усімі развітаўся, і яны пайшлі. Пасля іх у кабінет акупацыйнага губернатара зайшоў асабісты сакратар, ён адчыніў фортку, каб праветрыць пакой.

Выкінутыя з памяшканняў, якія займалі Народны Сакратарыят і Гарадская камендатура, грамадаўцы вырашылі сабрацца на кватэры ў Зайца, загадчыка спраў Народнага Сакратарыята, каб абмеркаваць становішча, у якім яны апынуліся.

— І навошта было згаджацца, каб у нас збіраліся? — накрываючы стол, бубніла нездаволеная жонка. — Пажаруць усё, як мы будзем жыць?

— Цыц, баба! — не сцярпеў Заяц, у яго і так розум мутнеў. — Не твая справа!

— Вы немцаў хлебам-соллю сустракалі, а яны вам анучай па зубах,—не ўнімалася кабета.

— Нічога не зробіш, прыходзіцца цярпець, палітыка, — апраўдваўся Заяц.

— Ніякія вы не палітыкі, а палітыканы! — выпаліла жонка і сама спалохалася сказаных слоў.

Муж с кулакамі кінуўся да жонкі. Яна, мажная, стаяла, узяўшыся ўбокі, з месца не скрануўшыся адно ўздрыгвалі вусны. Каля яе гудзеў, як авадзень, шчупленькі і дохленькі муж, але крануць не асмеліўся.

— Хіба ж я, Лявонка, пра сябе клапачуся...

— То і я не аб сабе дбаў, Мальвінка, калі на плячах валачыў з бальшавіцкіх складаў правіянт, — перабіў Заяц. — Думаеш, што мне не шкада здабытае нялёгкай працай страчваць, але прыходзіцца... «Ты, Заяц, — кажуць, — больш за ўсіх прыхапіў, вось у цябе і збярэмся...»

— Добра, — прагрымела Мальвіна. — Я ўсё выстаўлю на стол, але потым будзеш ляскаць зубамі...

— Усяго не трэба, — пайшоў на прымірэнне Заяц. — Зрабі толькі, каб не свяціць вачыма...

Праз некаторы час гаспадыня заставіла стол талеркамі, на якіх танюсенькімі скрылькамі былі нарэзаны каўбаса некалькіх гатункаў, вяндліна, бэконная свініна, галандскі сыр, адкрыты па дзве бляшанкі кілек, шпротаў і сардзінаў.

— А дзе хлеб? — спытаўся Заяц. — Добрая гаспадыня перш за ўсё ставіць на стол накроены хлеб.

— Не сунь свайго носу, куды не трэба!—агрызнулася Мальвіна, у яе ад злосці закалаціліся рукі. Жанчына ўпусціла талерку, на якой з верхам ляжалі срабрыстыя тараны. Ад талеркі засталіся адны чарапкі, разляцелася ва ўсе бакі рыба.

— Чаго цябе калоціць трасца? — Заяц пачаў збіраць тараны. — Знайшла пачастунак членам урада?

— Твае члены ўрада гроша ламанага не варты, — падбірала чарапкі Мальвіна. — Ніхто іх усур'ёз не прымае... ні народ... ні немцы...

— Нясі на кухню тараны!

— Вар'ят, лепшай закускі пад піва не трэба!

— Хіба толькі, — апамятаўся Заяц.

— Тота ж, — радавалася, што ўзяла верх Мальвіна. — Прынясі глыбокую талерку!

Яны падабралі тараны, паклалі ў талерку і паставілі на стол.

— Скажы, чаму ты пачала накрываць стол не з хлеба? Ты ж вырасла ў вёсцы і ведаеш беларускі звычай.

— Гэта для добрых людзей перш за ўсё ставяць на стол хлеб і соль. А такіх, як твае сённяшнія «госці», качаргою частуюць... Маліся богу, што ў мяне мяккі характар...

— Ого!

І яны, разумеючы адно аднаго, заўсміхаліся.

Мальвіна пачала раскладаць відэльцы і нажы, а Лявон расстаўляў келіхі і шклянкі.

— Ну, як стол? — спытала Мальвіна.

Лявон моўчкі калупнуў відэльцам вяндліну і прагаварыў.

— Ну і хітрушчая ж ты баба, проста чорт! Уражанне такое, што поўны стол, а як прыгледзішся, дык адзін падман.

— Ад цябе навучылася: не падманіш, не пражывеш, — зарагатала Мальвіна.

Пастукалі ў дзверы. Гаспадары кінуліся сустракаць гасцей.

— Заходзьце! — шырока адчыніла дзверы. — Распранайцеся! — запрашала яна. — Як мы рады, што вы ў нас вырашылі сабрацца.... Гэтакая падзея, ашчасліўлі!..

Гаспадар увіваўся каля гасцей, памагаў ім распранацца. Асабліва ён скакаў каля пана Скірмунта і ксяндза Гадлеўскага, жадаючы ім дагадзіць.

— Цеснавата крыху ў нас будзе, але што зробіш, — падлізваўся Заяц.

— У цеснаце, але не ў крыўдзе,— перабіраў у руках ружанцы Гадлеўскі.

— Але і пасыцела ж ты кума ці то ад ляноты, ці ад абжорства? — жартаваў Лытка. — Ну, чым будзеш частаваць?

— Напэўна, верашчакаю з сялянскай каўбасы

(Заканчэнне на 4-й стар.)

☆

Камсамолец Юрый Кісялёў прыйшоў на Жлобінскую фабрыку мастацкіх вырабаў пасля заканчэння Косаўскага вучылішча прыкладнога мастацтва. За кароткі час юнак распрацаваў некалькі ўзораў мастацкай разьбы па дрэву і косці. Арыгінальныя і шкатулкі, інкруставаныя ім.

На здымку: Юрый Кісялёў апрацоўвае рог.

Фота **Ф. Раманава.**
Фотахроніка БЕЛТА.

☆

рата Крапівы, аўтар страсна і тэмпераментна змагаецца з усім тым, што перашкаджае сучаснай байцы стаць на ўзровень лепшых дасягненняў, дабіцца новых творчых заваёў. Даследчык не пабаяўся парушыць інерцыю звыклых крытычных сцвярджэнняў аб няўхільным развіцці кожнага літаратурнага жанра. Ён з горыччу зазначае, што сённяшняя байка пачынае здаваць свае наступальныя пазіцыі. Яна не пагарджае выпадковымі сітуацыямі і сюжэтамі, неахайна абыходзіцца з жывым народным словам, не ўмее дасягнуць публіцыстычнай завостранасці, губляе афарыстычную трапнасць і сілу, збіваючыся на нуднае рытарычнае маралізаванне. Часта ёй «не стае шырыні погляду на жыццё, асэнсавання грамадскай сутнасці тых з'яў, якія становяцца аб'ектам мастацкага адлюстравання». Гэта прыводзіць да ілюстрацыйнасці байкі, якая не дае вялікіх паэтычных абагульненняў і таму паступова страчвае сваю грамадскую ролю. Нудная і бясколерная байка нярэдка становіцца «прыстанішчам шаблону і штампаў, шэрасці і пасрэднасці».

Такі вывад даследчыка зусім не з'яўляецца, як можа здацца некаторым байкапісцам, дачасным песімізмам. Аўтар далёкі ад таго, каб адмаўляць магчымасці байкі, яе неабходнасць і дзейснасць у наш час. Якраз наадварот. Я. Казека спрачаецца з тымі, хто спрабаваў ці спрабуе адпяваць байку, замахвацца на само яе існаванне. А калі даследчык пратэстуе супраць «немачы» і бяссілля сучаснай байкі, дык ён робіць гэта толькі таму, што добра ведае магчымасці жанра. Ды, урэшце, Я. Казека пераканаў, што наша байка яшчэ «ачуняе» і набярэ разгон. Для гэтага ёй трэба аднавіць і пашырыць сувязі з жыццём народа. Толькі пры такой умове байку чакаюць сапраўдныя творчыя поспехі.

«Шлях да новага ўздыму баечнага жанра, — з глыбокай пераканальнасцю піша аўтар, — не ў вяртанні назад да прытчы, да ўмоўных алегорый, разлічаных на тое, каб ілюстраваць пэўную думку павучальнага характару...

Сучасная байка патрабуе новай формы. А галоўнае — яна імкнецца вырвацца на шырокія прасторы жыцця. Толькі жывая рэчаіснасць можа даць байкапісцам новыя тэмы і вобразы, толькі ў жыцці здолеюць яны знайсці для сваіх твораў канкрэтныя характары, яскравыя сатырычныя тыпы. Прыпадзе байка зноў да жывых творчых народных крыніц — і, няма сумнення, вырастуць у яе крылы для новага ўзлёту».

У кнізе Янкі Казекі, сустракаюцца спрэчныя ці недастаткова абгрунтаваныя палажэ

ПА КАНЦЭРТНЫХ ЗАЛАХ

Госці са Злучаных Штатаў

Духавому аркестру Мічыганскага ўніверсітэта (ЗША), канцэрты якога з вялікім поспехам прайшлі ў Мінску, 65 год. Аднак цяжка ўявіць сабе творчы калектыў больш малады, чым гэты. І справа не толькі ў тым, што сярэдні ўзрост ста амерыканскіх юнакоў і дзяўчат, якія складаюць аркестр, не перавышае 22-х год. Справа ў тым захапленні, палымянасці, маладзёжным агеньчыку, якімі вызначаецца ігра гэтага таленавітага калектыву.

Кіруе аркестрам амаль 30 год доктар Уільям Д. Рэвелі. Вялікая праца, гэтага выдатнага і вопытнага майстра, заслугоўвае самай высокай ацэнкі. Пад яго кіраўніцтвам аркестр прадстае перад намі як адзін дасканалы інструмент.

Калі слухаеш ігру маладых амерыканскіх музыкантаў, часам забываеш, што перад табою духавы аркестр. Надзвычайная мяккасць і цеплыня тэмбраў, здзіўляючая аб'ёмнасць гучання, поўная адсутнасць рэзкасці характарызуюць гэты аркестр. Яго ігра настолькі сімфанічная, што часта здаецца, быццам чуеш тэмбры скрыпак і віяланчэляў, якія адсутнічаюць. Калі да гэтага дадаць вялікую рытмічную і ансамблевую дакладнасць, цудоўны строй, добрую фразіроўку, стане ясна, што гэта аркестр высокага класа.

Хацелі таго нашы госці ці не, але атрымалася так, што «руская» і «еўрапейская» часткі праграм прагучалі цікавей за «амерыканскую».

З адчуваннем характару рускай музыкі, з тонкай нюансіроўкай былі выкананы шэсце з оперы-балету «Млада» Рымскага-Корсакава і фінал Першай сімфоніі Калінніка. Сапраўды руская шырыня адчувалася ў «Багатырскіх варотах» Мусаргскага. Характэрны гумар адчуваўся ў выкананні маршу Пракоф'ева, задорна прагучаў галоп з сюіты «Камедыянты» Кабалеўскага. Да «рускай» часткі праграмы хочацца аднесці і фантазію на тэмы песень «Полюшка» і «Чатанка», напісаную амерыканскім кампазітарам Гулдам і выдатна сыграную аркестрам.

«Амерыканская» частка праграмы прайгравала таму, што была прадстаўлена не лепшымі творамі. Калі сюіта са старадаўніх амерыканскіх танцаў Бенета, якая не прэтэндуе на сур'ёзнасць і змястоўнасць, мае некаторую цікавасць, дык гэтага нельга сказаць пра музыку да камедыі «Май фэр лэдзі» Лоў, пра «Карнавальнае шэсце» Лекуэна, марш Суза. Прыемным выключэннем з'явілася добрая п'еса для саксафона з аркестрам Крэстона, выдатна сыграная Даналь-дам Сінта. Ім жа была выканана вядомая калыханка з оперы «Поргі і Бес» Гершвіна.

В. БАРСАЎ.

На здымку: выступае філарманічны духавы аркестр Мічыганскага ўніверсітэта.

Фота **Ул. Крука.**

„Не выйдзе, панове!“

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)

сою, — пацірaў рукі Кастроўскі. — У Мальвіны Іванаўны заўсёды бліны пухлыя, як яна сама.

— Чым багаты, тым і рады, — паружавелі шчокі ў Мальвіны. — Выбачайце, але такога пачастунку, як пры Мікалаю Другім быў, пры кайзеры Вільгельме Другім не будзе.

— Ах, ты пампушка! —ушчыкнуў Кастроўскі.— Не прыбядняйся. Твой Заяц аказаўся вельмі ўвішны, усе склады абчысціў.

— Што за фамільярнасць! — нездаволена вымавіў Скірмунт.

— Але, — падтрымаў Гадлеўскі. — Здаецца, і вы нахапалі сала.

— Не столькі таго сала, як звону,—апраўдваўся Кастроўскі.

— Спадары! — запрашаў Заяц. — Проша да стала!

— Але, там разбяромся, хто больш ухапіў,— падкалоў Лытка. — Хоць, чорт яго шкадаваў, бальшавіцкага...

Апошнім прыйшоў Езавітаў. Ён быў пахмуры, злаваў на ўвесь свет і на сябе, шкадаваў, што не даў добрай праборкі бялесаму Бюхнеру, які нахабна трымаўся.

— Чаму такі пануры? — яшчэ ў пярэдняй спытаў Лытка.

— Трэба мяняць арыентацыю, — ужо ў сталовай адказаў Езавітаў.—От гэта стол!—здзівіўся ён.

— Не хвалі раней часу, абвёў спрактыкаваным вокам Кастроўскі. — Дзе толькі ты, Мальвіна Іванаўна, навучылася такой далікатнасці? Пачыноўніцку, здорава!

— А па-кулацку, пшык, — збялела Мальвіна, адчуваючы, што не тое гаворыць. — Хто чым можа, тым частуе.

Гаспадар гарэў ад сораму, яго твар пабіла на плямы. Ен, нібы чакаючы яшчэ больш моцнага ўдару, уцягнуў шыю ў плечы. Потым паспяшаўся на кухню і вынес адтуль графін з неразведзеным спіртам.

— Прашу, госцейкі, за стол! — запрашала Мальвіна.

Госці, не спяшаючыся, садзіліся.

Лявон, хаваючы вочы, не шкадуючы наліваў у келіхі спірт, разліваючы на абрус.

— Частуйцеся, даражэнькія, мы вельмі вам рады, — прапанавала Мальвіна. — Мой гаспадар заўсёды кажа: каб нашага дому ніхто не цураўся. Вось такі ён у мяне! — паддобрывалася яна.

— За што ж будзем піць? — узняў келіх Скірмунт. — Панове! Мы сабраліся не ў госці, а каб абсэймаваць, што рабіць.

— Але, — дагледліва падтрымаў Заяц.

— Пан Езавітаў прапанаваў нам змяніць арыентацыю, — працягваў Скірмунт. — А толькі аб змене арыентацыі не можа быць нават гаворкі. Лепшых заступнікаў, чым немцы, мы не знойдзем. І правіцыя не падтрымае...

— Хто? — спытаў Езавітаў.

— Ну хоць бы пан Астроўскі, са Случчыны, — адказаў Скірмунт. — Я прапаную выпіць за здароўе яго вялікасці Вільгельма Другога! Віват!

— Віват! Віват! Віват! — пад звон келіхаў віталі кайзера.

— А-ах, мацунак!—крактануў Кастроўскі. — Што ж ты не папярэдзіў, што гэта спірт?

— Разбаўлены? — спытаў Скірмунт.

— Не, — прызнаўся Заяц.

— Я не магу, — Скірмунт адліў у шклянку палову келіха і даліў вады. — Будзьце здаровы!

— На здароўечка! — пажадала Мальвіна.

— Толькі сапсулі пітво, — ухмыльнуўся Кастроўскі.

Усе выпілі, акрамя гаспадара, які быў не ў сваёй талерцы. І гаспадыня прыгубіла. Умомант закуска знікла са стала. Узяліся за тараны. Лявон злосным позіркам акінуў Мальвіну, выйшаў на кухню і вынес адтуль цэлы кумпяк.

— Не паспелі нарэзаць, — вінавата апраўдваўся ён.

— Ой! — выпаў з рук Мальвіны відэлец, бразнуўся аб падлогу і зазвінеў. — Нехта, мусіць, спяшаецца...

— Усё роўна не паспее, даў зевака, — сам сабе пад нос прагаварыў Лытка.

— От гэта размах! — расплыўся Кастроўскі.— Цілігент, а характар мае.

Лявон зноў наліў келіхі. Кастроўскі, не саромеючыся, адрэзаў добры кавалак тлустага кумпяка, аднаго сала.

— За здароўе гаспадароў! —не чакаючы астатніх, выпіў ён і стаў аплятаць, нават добра не разжоўваючы, глытаў вэнджанае сала.

Выпілі і астатнія, дружна talі закусваць, не трэба было ніякай прынукі. Елі, аж насы гнуліся. Пасля Лявон падаў піва, а Мальвіна яшчэ тараноў. І хоць на кухні муж цішком атрымаў штурхеля ад жонкі, але ўсё ж адчуваў сябе пераможцам. Цяпер яны абое рабілі выгляд задаволенасці.

— Панове! — пачаў Скірмунт. — Я паўтараю, арыентацыя ў нас павінна быць толькі на Германію. Нямецкія войскі стаяць у Беларусі, а не французскія, не англійскія і не амерыканскія.

— Немцы зусім з намі не лічацца, нахабна выгналі з памяшканняў, якія займалі Народны Сакратарыят і Камендатура, — выкрыкнуў Езавітаў, ён ужо ап'яней. — А вы заклікаеце на іх арыентавацца? Ганьба!

— А што вы прапануеце? — спытаў у Езавітава Гадлёўскі.

— Павесці з імі барацьбу, — адказаў Езавітаў.

— Гэтым падтрымаць бальшавікоў, — уставіў Лытка.

— О, не-е! — запярэчыў Езавітаў. — За каго вы мяне лічыце. Бальшавікі — нашы горшыя ворагі!

— Да французаў, англічан ці амерыканцаў звярнуцца? — дапытваўся Гадлеўскі.

— Дапамогуць яны, як кашаль хваробе, — злаваўся Езавітаў.

— Тады нічога не застаецца, як з немцамі сябраваць, — заключыў Гадлеўскі.

— Пасябраваў воўк з кабылаю, засталіся хвост з грываю, — іранізаваў Езавітаў.

— Не кожную кабылу і воўк зарэжа, — умяшаўся ў размову Кастроўскі. Як павернецца кабыла задам — трасцу воўк возьме. Зубоў недалічыцца. Ён заўсёды наровіць схапіць ахвяру за горла.

— Не такія немцы ворагі, — загаварыў Заяц.— Яны хочуць, каб мы ім памагалі, павялі больш рашучую барацьбу з бальшавікамі, якія разгарнулі падпольную работу, арганізоўваюць партызанскія атрады.

— Дзе тыя партызанскія атрады? — запярэчыў Езавітаў. — Нідзе я іх не бачыў.

— Затое я іх бачыў,—паведаміў Кастроўскі.— Атрады Аляксандра Салаўя ў Рудабелкаўскай воласці і Саўкі Касача на Тураўшчыне ўжо дзейнічаюць. Туды нямецкія гаспадарнікі і носу не паказваюць. А гэта пакуль кветачкі, а ягадкі напарадзе.

— Праўда? — здзівіўся Езавітаў.

— Няўжо ж, — сцвердзіў Кастроўскі. — Атрад Саўкі Касача вось дзе ў мяне сядзіць, — паказаў сабе на карак Кастроўскі. — У лесе цяпер не я, а ён гаспадарыць... Ляснулі мае грошыкі...

— Немцы могуць дазволіць нават стварыць беларускае войска і пазыку для гэтага дадуць, калі толькі гэтае войска павядзе барацьбу з партызанамі, — працягваў Заяц.

— Дзіва што, каб брат брата забіваў, — перабіла яго Мальвіна.

— Які табе бальшавік брат?! — сыкнуў Заяц. — Калі што скажа, як пугаю па вадзе лясне... — Ён перадыхнуў. — Адным словам, падтрымку немцаў нашай справе трэба заслужыць...

— Так, нічога дарэмна не даецца, — ухапіўся за гэтую думку Скірмунт. — Унь украінцы колькі немцу даюць збожжа, мяса, тлушчу, вугалю, жалеза, руды — усяго не пералічыш. Эшалонамі адпраўляецца ў Германію ўкраінскае дабро. То і мы тое-сёе маглі б даць, хоць бы лес, хлеб, мяса, пяньку, скуры і іншае. А да ўсяго гэтага наша падтрымка іх сістэмы ваеннага кіравання, барацьба з бальшавіцкім падполлем і партызанамі. Вось тады яны адобрылі б стварэнне ўрада Беларускай Народнай Рэспублікі, які ўсім нам сніцца. І, рэч вядомая, дазволілі б стварэнне войска, якое ў будучым стала б апорай нашай дзяржавы.

Яшчэ доўга яны абмяркоўвалі становішча, у якім апынуліся, раіліся, што рабіць, якую ўзяць тактыку ў адносінах да акупантаў, нарэшце аднадушна выращылі пайсці і пакланіцца немцам, заявіць аб сваіх вернападданніцкіх пачуццях.

— Будзем прасіць іх дазволу стварыць урад Беларускай Народнай Рэспублікі, — гаварыў Скірмунт.

— І таксама беларускае войска, — дадаў Езавітаў.

— Зразумела, бо якая ж гэта будзе дзяржава без войска, — падтрымаў Гадлеўскі.

— А што да бальшавікоў, — працягваў Скірмунт, — дык не можа быць іншай думкі: яны — нашы ворагі, павядзём з імі самую рашучую барацьбу. Не можа быць, каб мы не напалі на след Галузы і не выкрылі Мінскі Падпольны Камітэт бальшавікоў.

— Тут усё ясна, — азваўся Лытка. — А як быць з партызанамі?

— Стойце, — узняў руку Гадлеўскі. — Дык жа ў нас на Тураўшчыне ёсць свой чалавек, Янка Мялешка, серадняк, дэлегат Беларускага кангрэсу, ён нам падможа ў гэтай справе.

— Быў ды сплыў, — выпаліў Кастроўскі. — Гэты серадняк стаў правай рукою бедняка, Саўкі Касача. Ух, разбойнікі!

— Нешта прыдумаем, — сказаў Заяц. — Сапраўды, партызанскія атрады лепей знутры ўзрываць.

— Дайце мне войска — і я іх умомант раздушу, — запэўніў Езавітаў. — Ёсць пра што гаварыць. — Ён падумаў. — Ага, каб не забыцца папрасіць пазыку!..

— Не-е, — сказаў Скірмунт. — Без пазыкі нам не жыць.

— Тады ўсё,— Езавітаў паглядзеў на гадзіннік і пазяхнуў.— Дадому!

Развітаўшыся, усе разыйшліся, задаволеныя поўнай дамоўленасцю аб далейшай дзейнасці.

Праз некалькі дзён генерал Фалькенгайн разам з акупацыйным губернатарам фон Пільцам прынялі дэлегацыю грамадаўцаў, якія паставілі пытанне аб стварэнні ўрада Беларускай Народнай Рэспублікі. Фалькенгайн і фон Пільц паўтарылі выказаныя раней умовы, якія зводзіліся да таго, што ўрад Беларускай Народнай Рэспублікі возьме на сябе пэўныя абавязацельствы перад урадам Германіі, аб якіх будзе паведамлена дадаткова.

— Мы на ўсё згодны,— ад імя дэлегацыі заявіў Скірмунт.— Толькі пад заступніцтвам германскай дзяржавы бачым мы росквіт нашай краіны ў будучым.

— Аб усім гэтым будзе даложана яго вялікасці, — абяцаў Фалькенгайн.

Скірмунт хацеў нешта сказаць.

— Сёння ж даложым,— не даў яму разявіць рот фон Пільц.— Мы разумеем, панове, вашу нецярплівасць. Улада — спакуслівая рэч. Запэўняем вас, што вы яе атрымаеце.

— З дазволу Германіі,— з салдацкай праставатасцю ўдакладніў Фалькенгайн.

— А пазыку? — спытаў Езавітаў.

— Магчыма, і пазыка будзе,— няўпэўнена адказаў фон Пільц.

— А чаму сярод вас няма памешчыка Астроўскага? — пацікавіўся Фалькенгайн.

— Ён на Случчыне ў сваім маёнтку заняўся гаспадаркай,— адказаў Скірмунт.

— Не толькі гаспадаркай, але і дапамог нам таго-сяго з непажаданых элементаў прыбраць да рук,— паведаміў фон Пільц.— Дзейсны чалавек!..

— О, так!—вымавіў Кастроўскі.—Нахапаў дабра... Цалкам аднавіў маёнтак...

— Здаецца, і з вас ніхто сябе не пакрыўдзіў,— заўсміхаўся фон Пільц.

Дэлегаты насцеражыліся.

— Не бойцеся, адбіраць назад не будзем,—заспакоіў фон Пільц.— Як рускія кажуць: што з воза ўпала, тое прапала...

На гэты раз генерал і акупацыйны губернатар былі больш ветлівымі, яны нават пачаставалі дэлегатаў чаем з бутэрбродамі.

Дэлегаты, разумеючы занятасць генерала Фалькенгайна і акупацыйнага губернатара фон Пільца, доўга не затрымліваючыся, падзякавалі за прыём і пачастунак, развіталіся і пайшлі.

З дня на дзень грамадаўцы і эсэры чакалі адказу ад германскага ўрада адносна магчымасці абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі. Некаторых з іх палохалі цяжкія ўмовы, прыняць якія яны фактычна ўжо згадзіліся, калі былі ў Фалькенгайна і фон Пільца. Лаялі за гэта Скірмунта, які паспяшаўся заявіць: «Мы на ўсё згодны».

Ужо і ўрад быў сфарміраваны, а адказу ўсё не было. За сваю паспешлівасць Скірмунт папляціўся. Ён пратэндаваў стаць старшынёю рады, але з гэтым не згадзіліся і пакінулі толькі членам яе.

Так на ўскраіне былой Расійскай імперыі быў створаны яшчэ адзін марыянетачны ўрад. Цяпер немцам лягчэй стала рабаваць народнае багацце. Акупанты следам за ўкраінскім адпраўлялі ў Германію беларускае дабро.

...Галуза з Параскай спаткаліся на явачнай кватэры, недалёка ад рэзідэнцыі генерала Фалькенгайна і акупацыйнага губернатара фон Пільца. З прыходам у Мінск кайзераўскіх войск Галуза ні разу не начаваў у сваёй кватэры. Ён быў на нелегальным становішчы. А зараз пасля стварэння ўрада Беларускай Народнай Рэспублікі і сям'я вымушана была хавацца. Бээнэраўцы далі абяцанне немцам знайсці і разграміць Мінскі Падпольны Камітэт бальшавікоў, злавіць Галузу, разбіць партызанскія атрады.

— Не ведала я, што немцы такія барахольшчыкі,— з болем у сэрцы разважала Параска.— Абдзіраюць людзей...

— Яны адчуваюць, што тут доўга не затрымаюцца, а таму ўсё хапаюць,— гаварыў Галуза.— Звярынае пачуццё — цягнуць у бярлогу. Гэтаму спрыяюць бээнэраўцы.

— З чорнымі душамі чалавечкі, — абурана вымавіла Параска.— Юды — прадаюць краіну.

— Іх песня спета,— зазначыў Галуза.— Нацыяналізм жывучы, але недаўгавечны. Узнімецца народ. А народу варта дзьмухнуць — будзе бура. Яна змяце з зямлі гніль. Пустазелле з поля вон!

— Харошы ты мой! — абняла Параска мужа.— Мы так рэдка з табою сустракаемся. Калі ўжо скончыцца гэтая чорная ноч?

— Хутка, — засвіціліся вочы ў Галузы.— Займаецца зара. Неўзабаве ўзыйдзе сонца.

— А дзе цяпер Алёнка? — заклапочана спытала Параска пра дачку.

— Малайчына наша Алёнка! — паведаміў Галуза.— Там, дзе яна пабыла, немцы з бээнэраўцамі нічога не здолелі ўзяць. Алёнка робіць вялікую справу. Табе няма чаго за яе непакоіцца. Яна — дзяўчына з галавою!

— Мацярынскае сэрца не можа быць спакойным, — прызналася Параска.

— Ведаю, — згадзіўся Галуза.— Аднак адклікаць яе, як і цябе пакінуць у горадзе, не магу. Зараз ты паедзеш на Случчыну. Нам неабходна ўзняць увесь народ на барацьбу з немцамі і іх падбрэхічамі. І гэта мы зробім, чаго б нам ні каштавала. Як немцы, так і бээнэраўцы будуць выкінуты з нашай зямлі. Ты нешта хацела сказаць?

— Не падабаецца мне гэта кватэра.

— Чаму?

— Пад носам у начальства.

— Вось гэта і добра, менш падазронасці.

— Будзь асцярожны, мой мілы!

Затрымлівацца доўга на явачнай кватэры нельга было. Галуза растлумачыў Парасцы яе задачу. Моцна пацалаваўшыся, яны абое выйшлі з кватэры і пайшлі хто куды.

У літаратараў братніх краін

АД РАБОЧАГА— ДА ПІСЬМЕННІКА

Як паведамляе нямецкі штотыднёвік «Зонтаг», споўнілася пяць год з дня заснавання Літаратурнага інстытута імя Бехера ў Лейпцыгу. За гэты час яго скончылі некалькі дзесяткаў былых рабочых і сялян. Вось некалькі тыповых біяграфій выпускнікоў інстытута.

Пяцідзесяцігадовая Марта Вебер доўгі час была звычайнай работніцай абутковай фабрыкі, сын гарнярка Марцін Фіртэль — салдатам. Апошнія некалькі год правёў у амерыканскім палоне, пасля вяртання на радзіму стаў забойшчыкам, машыністам, затым — інструктарам маладзёжных арганізацый. Герберт Фрыдрых быў у савецкім палоне. Вярнуўшыся на радзіму, працаваў рознарабочым, затым настаўнікам.

У час вучобы ў інстытуце і пасля заканчэння яго гэтыя людзі выступілі ў друку з цікавымі мастацкімі творамі.

Літаратурны інстытут у Лейпцыгу створан па ўзору Інстытута імя Горкага ў Маскве. 30 слухачоў гэтай установы на працягу трох год вывучаюць філасофію, псіхалогію, нямецкую і сусветную літаратуры, стылістыку, гісторыю мастацтваў, эстэтыку. Асаблівая ўвага аддаецца вывучэнню палітэканоміі. Лепшыя пісьменнікі ГДР кіруюць у інстытуце творчымі семінарамі па лірыцы, драме і прозе.

У ГДР рэалізуецца лозунг «Рабочы, бярыся за пяро!», высунуты некалькі год назад Сацыялістычнай адзінай партыяй Германіі.

ДЫСКУСІЯ АБ ПАЭЗІІ

На старонках польскага літаратурна грамадскага штотыднёвіка «Нова культура» вось ужо трэці месяц працягваецца дыскусія аб сутнасці і задачах паэзіі. Спрэчку пачаў вядомы паэт старэйшага пакалення Антоні Сланімскі, які апублікаваў у другім нумары часопіса за гэты год твор «У абарону верша». Аўтар б'е трывогу з прычыны таго, што некаторыя маладыя паэты знарок ускладняюць, зацямняюць сэнс сваіх твораў, пазбаўляюць іх рыфмы і рытму.

Для трывогі А. Сланімскага ёсць падставы. Вершы некаторых паэтаў пабудаваны на такіх аддаленых асацыяцыях і параўнаннях, што для чытача яны застаюцца неразгаданым рэбусам. Многа невыразнага і цьмянага ў новым зборніку «эратычных» вершаў Станіслава Граховяка «Распрананне перад сном». А Станіслаў Чыч прапануе чытачу такі набор гукаў:

О Ману о элё раскоша
Усход зорка
раскоша ўрэшце о Ману хха
пакуль
у зорках
о элё о ха ха о Ману
о

Думкі, выказаныя ў творы «У абарону верша», Сланімскі развіў у «Адкрытым пісьме да чытачоў...» Значную частку адказнасці за становішча маладой паэзіі аўтар ускладае на крытыку, якая часамі дэзарыентуе моладзь, хваліць тое, што варта асуджэння. Сланімскі падкрэслівае, што псеўданаватарства супярэчыць сацыялістычнаму светапогляду, бо на справе гэта — «перажыткі варварскага італьянскага футурызму, ...сюррэалістычных канцэпцый Андрэ Брэтона». У заключэнне аўтар артыкула зазначае, што так званая «сучасная» паэзія ігнаруе чалавека, яго пачуцці.

Першымі на выступленні А. Сланімскага адгукнуліся Юльян Рагазінскі і Станіслаў Граховяк. Першы з іх у асноўным пагаджаецца са Сланімскім, аднак зазначае, што практычна крытыку цяжка адрозніць сапраўднае наватарства ад псеўданаватарства. С. Граховяк піша, што і сам ён «знерваваны сучасным становішчам маладой польскай паэзіі», і сам часта палемізуе з сабой. Галоўная бяда маладых не ў тым, што іх іерогліфы — параўнанні вельмі складаныя, а што яны адарваны ад рэальнасці, ад канкрэтнай «птушкі», расліны ці пейзажу». А гэта прыводзіць да бязлікасці, з верша нельга даведацца, што аўтар адчувае, што любіць і ненавідзіць. Разам з тым Граховяк лічыць кансерватыўным патрабаванне Сланімскага ацэньваць верш толькі па наяўнасці рытму ці рыфмы.

З цікавым артыкулам «Фальшывыя сігналы наватарства» выступіў у дыскусіі вядомы паэт Юльян Пшыбось. Разгледзеўшы пытанні наватарства і псеўданаватарства ўвогуле, зазначыўшы, што пошукі новай формы перш за ўсё выразныя ў выяўленчым мастацтве, востра пакрытыкаваўшы палотны абстракцыяністаў, аўтар назваў рэчы сваімі імёнамі. «Авангардызм» некаторых маладых паэтаў, гаворыць ён, — гэта праявы дэкадэнцтва».

Удзел у дыскусіі прыняў і пісьменнік старэйшага пакалення Мечыслаў Яструн. Пагаджаючыся з некаторымі выказваннямі Сланімскага, ён адначасова абараняе маладую паэзію «ад няслушных закідаў», абараняе асацыятыўны верш.

Дыскусія аб паэзіі працягваецца. Цяжка прадбачыць яе канчатковыя вынікі. Адно несумненна: выступленні А. Сланімскага, няхай не ва ўсім бездакорныя, прынясуць карысць маладой польскай паэзіі.

ЛЕПШЫЯ ТВОРЫ 1960 г.

Камісія па прысуджэнню дзяржаўных прэмій імя Клімента Готвальда апублікавала ў чэшскім штотыднёвіку «Літэрарні новіны» спіс твораў, якія прадстаўлены сёлета на атрыманне высокай узнагароды. Сярод іх—зборнік вершаў Стэфана Жарага «Вечна жывы Ікар» і апошні раман славацкага пісьменніка Ладзіслава Мнячкі.

А. РАСОЛЬСКІ.

Чалавек пайшоў...

Ён не верыў, што здолее ўстаць і пайсці. Ужо былі зняты бінты і шыны, але ён сядзеў і глядзеў на сваю нагу, быццам бачыў яе ўпершыню. Рукі па прывычцы пацягнуліся да мыліц.

— Ну, смялей!

І ён упершыню за гэтую гадзіну адарваў позірк ад сваіх ног і глянуў на Вольгу Дзмітрыеўну. Глянуў проста ў вочы, нібы шукаючы адказу на свае сумненні, шукаючы рашучасці. А яна цёплацёпла ўсміхалася і падбадзёрвала:

— Прайдзіце. Смялей, смялей...

І ён пайшоў. Пайшоў спачатку асцярожна, моцна накульгваючы на правую нагу, баючыся ступіць на поўную ступню. Потым усё смялей і смялей. І раптам яму захацелася бегчы, бегчы, як некалі ў дзяцінстве!

А Вольга Дзмітрыеўна ішла за ім па шырокім калідоры інстытута, гатовая кожны момант падхапіць яго. Яна была падобна да маці, дзіця якой стала на ногі і рабіла першыя крокі.

Ён раптам спыніўся, павярнуўся да Вольгі Дзмітрыеўны. На вачах былі слёзы. Ён узяў яе руку і прыпаў вуснамі.

— Вось вы хутка паедзеце дадому... Я хацела б ведаць пра ваша здароўе, — сказала ўрач.

— Напішу вам...

Сонечныя праменні ўрываліся ў вокны. Ён стаяў у гэтым святле, стараючыся ўявіць сабе, як прыедзе дадому, будзе ісці вуліцай сваёй вёскі, так, як усе, не абапіраючыся на мыліцы, — і не мог. Бо прайшло 15 год, доўгіх і балючых. Дзесяцігадовы хлапчук, ён захварэў касцявым туберкулёзам. Нагу залячылі, але яна так і засталася сагнутай у калені. І як ён пакутаваў, калі яго сябры-аднагодкі бегалі навыперадкі, а ён вымушаны быў толькі назіраць.

Ішлі гады. Хлапец рос. Нага ўжо не даставала зямлі, і спатрэбіліся мыліцы.

Так з мыліцамі ён і прыехаў у Мінскі навукова-даследчы інстытут траўматалогіі і артапедыі. Аперацыя была складанай. Дакладней кажучы, трэба было зрабіць іх дзве. Спачатку выправілі каленны сустаў — гэта толькі падрыхтоўка да галоўнай аперацыі. Потым навуковы супрацоўнік інстытута Вольга Дзмітрыеўна Жукоўская рабіла падлікі, чарцяжы. Урэшце настаў дзень...

Вольга Дзмітрыеўна схілілася над хворым. Марлевая павязка закрыла частку яе твару, і толькі па вачах можна здагадацца, што выпадак сур'ёзны. Побач асістэнты. Разрэзана мяккая тканіна нагі. Уключан апарат, якім трэба зрабіць падоўжны разрэз косці з двума папярэчнымі надрэзамі. Амаль дзве гадзіны дробназубыя пілачкі грызуць косць. Хворага адвозяць у палату...

Толькі аперацыя яшчэ не скончылася. Яна будзе працягвацца амаль два месяцы. Кожны дзень апарат Гудушауры будзе, дакранаючыся косці голені, расцягваць яе на 2—3 міліметры, а пустата, якая атрымліваецца, павольна запаўняцца касцявым мазалём. Так ледзь-ледзь прыкметна будзе расці нага. Гэта вельмі адказны перыяд. Трэба, каб не парушыліся тканіны, каб не атрымалася пустаты між надрэзамі косці, каб яна своечасова запаўнялася касцявымі тканкамі.

Выпадак быў не з частых. Правая нага — на цэлых 14 сантыметраў карацей ад левай. А яна павінна зрабіць іх роўнымі. Давялося падоўжыць бядро на 7 сантыметраў і голень — на 5.

І вось усё абыйшлося добра. Упершыню за апошнія 15 год ён пайшоў на абедзвюх нагах. Рукі, якія прывыклі сціскаць мыліцы, засталіся без работы. Ён не ведаў, куды іх дзець.

Сёстры, хворыя ўсхвалявана глядзелі яму ўслед. Ім было радасна, што чалавек пайшоў...

Ён яшчэ раз павярнуўся. А Вольга Дзмітрыеўна? Дзе яна?

Вольга Дзмітрыеўна ўжо ў лабараторыі. Лабараторыя яе — звычайная аперацыйная, з мноствам святла, прыбораў першакласнай айчыннай апаратуры. Словам, усё, неабходнае для аперацый касцявой тканкі.

Скупа гаворыць Вольга Дзмітрыеўна пра сябе:

— Вайна застала мяне на трэцім курсе Мінскага медыцынскага інстытута. Фронт. Пасля вайны я ўсё ж скончыла інстытут у Мінску. Улічыўшы маю хірургічную практыку, адразу ўзялі ў клініку. Вось і ўсё...

Не, гэта не ўсё. Вольга Дзмітрыеўна вельмі сціплая. Яна не сказала, што больш 40 чалавек яна паставіла на ногі, адняла ў іх мыліцы, выслабаніла іх рукі для працы. Рукі, што некалі сутаргава сціскалі мыліцы і кіёчкі, водзяць трактары, уключаюць станкі, трымаюць пілу, а калі скончыцца працоўны дзень, адпачываюць у цёплых кішэнях або нясуць пакупкі родным.

Вольга Дзмітрыеўна цвёрда паставіла на ногі С. Сямёнава, Н. Хала, І. Паўлоўскага і інш. Гэта з 1 красавіка 1957 г., з дня першай яе аперацыі. Да гэтага часу такія аперацыі ў нашай рэспубліцы не рабілі.

Нядаўна ёй прапанавалі стаць галоўным урачом адной з паліклінік Мінска. Дала згоду. І не вытрымала. Праз два тыдні вярнулася да сваіх аперацый: не можа жыць без людзей, якія чакаюць яе дапамогі. Трывога за іх лёс ніколі не пакідае Жукоўскую. Такі ў яе характар.

Н. ЛАГУН.

Падзеі, факты, навіны

1942 год. Віцебскія лясы. Вялікая група патрыётаў арганізавалася ў партызанскі атрад «Баявы». Два гады народныя мсціўцы не давалі спакою гітлераўскім акупантам: пускалі пад адхон паязды, узрывалі масты і дарогі. У 1944 г. народныя мсціўцы ў гонар 26-й гадавіны Савецкай Арміі і двухгадовай дзейнасці атрада вырашылі зрабіць памятны значок. За справу ўзяліся партызаны-майстры. Яны адчаканілі з серабра значкі, якімі былі ўзнагароджаны каля 20 лепшых партызан-воінаў. На значку надпіс «Два гады ў тыле ворага. Атрад «Баявы». 1942—44». У цэнтры значка — зорка.

Пасля вайны значок стаў рэдкасцю. Нядаўна супрацоўнікам Дзяржаўнага музея Вялікай Айчыннай вайны ўдалося знайсці яго. Значок экспануецца ў музеі.

На здымку: значок атрада «Баявы».

Фота **Ул. Крука.**

Разбіраючы дом

Нядаўна работнікі саўгаса «Дамачэўскі» Брэсцкай вобласці Аляксей і Дзмітрый Ганжа разбіралі стары дом, у якім жыў некалі іх бацька Фама Ганжа. У нішы на гарышчы яны знайшлі некалькі кніг — выданні, якія нелегальна распаўсюджваў у гады панскага ўладарання Фама Ганжа.

Вось часопіс «Акно», выпушчаны ў 1930 г. У ім апублікаваны апавяданне Аляксандра Гаўрылюка «Наіўны мурын», камедыя Яраслава Галана «90%», выказванні нямецкіх антыфашысцкіх пісьменнікаў Ганны Зэгерс, Іяганеса Бехера, Егоі Эрвіна Ніша, Эрнста Глезера. У часопісе змешчаны цікавыя малюнкі, карыкатуры, якія выкрываюць буржуазную дэмакратыю.

У другім часопісе «Наша праўда» № 4, выпушчаным у лістападзе 1935 г., надрукавана прамова Георгія Дзімітрава на заключным пасяджэнні VII кангрэсу Камінтэрна.

Вось яшчэ дзве кнігі. Адна «Асноўныя пытанні марксізму»—Пляханава (выдадзена ў 1925 г.), другая— «Стахановцы — героі будаўніцтва».

Рэакцыйны польскі ўрад усімі сіламі спрабаваў задушыць рэвалюцыйны рух беларускага народа. Камуністы пайшлі ў падполле.

Усе меры асцярожнасці прыняў і Фама Ганжа. Ён актыўна распаўсюджваў падпольную літаратуру, лістоўкі, пракламацыі. Атрымліваючы іх, Фама Ганжа хаваў кнігі на гарышчы і ноччу разносіў па вёсках.

У верасні 1939 г. Фаму Ганжа, кнігалюба, прызначылі загадчыкам клуба, выбралі дэпутатам сельскага Савета. Але вось пачалася вайна. Вёску занялі гітлераўцы. У маі 1942 г. фашысты яго арыштавалі і праз некалькі месяцаў расстралялі.

Такая кароткая гісторыя цікавай знаходкі.

Для турыстаў

Падарожжы па роднай краіне становяцца самым папулярным відам адпачынку.

Турысцкі рух, які ўвесь час расце, падказаў неабходнасць арганізаваць маршруты мясцовага значэння. Створаны яны і ў Беларусі.

У мінулым годзе па пуцёўках на рэспубліканскіх маршрутах правялі свой адпачынак больш трох тысяч турыстаў Беларусі. Яны адпачывалі на турысцкіх базах «Возера Нарач», «Браслаўскія азёры».

Вялікія будаўнічыя работы ідуць на турысцкай базе «Возера Нарач». Тут будзе здадзена ў эксплуатацыю 13 жылых дамоў. За тры летнія месяцы турысцкая база «Возера Нарач» абслужыць каля трох тысяч турыстаў. База «Браслаўскія азёры» абслужыць больш 600 турыстаў. У чэрвені адкрыецца новая турысцкая база на Заслаўскім водасховішчы на сто месц у змену. Многія прадпрыемствы будуюць турысцка-аздараўленчыя лагеры. На возеры Нарач сваю базу будуць мець трактараводцы. На базе піянерлагера ў зімовы час працуе лыжная турысцкая база будаўнічага трэста № 4 Міністэрства будаўніцтва.

Жыхары турысцкіх баз па новых маршрутах пройдуць на радзіму народнага паэта Беларусі Янкі Купалы, пазнаёмяцца з ваколіцамі Астрашыцкага Гарадка, Заслаўя.

Б. НЯДЗВЕЦКІ.

Навучэнцы і педагогі музычнай школы, у пасёлку Мінскага трактарнага завода часта выступаюць з канцэртамі перад рабочымі цэхаў. Днямі адбыўся канцэрт педагогаў школы ў самым вялікім на заводзе інструментальна-штамповачным корпусе. З вялікай увагай слухалі рабочыя «Раманс» Гліэра і «Венскую песню» Крэйслера ў выкананні скрыпача С. Ронькіна, «Трагічны паланез» Шапэна ў выкананні піяністкі Л. Рудэнка. Інструментальны дуэт у складзе Д. Пась (цымбалістка) і А. Жбанко (баяніст) сыграў «Дзве ўкраінскія народныя песні» ў апрацоўцы І. Жыновіча і «Свецел месяц» у апрацоўцы Я. Цікоцкага. Цёпла прынялі слухачы спявачку Л. Барысаву, якая праспявала вакальныя творы Глінкі і ўкраінскую песню «Гандзя».

Г. ВАЎКАВІЦКАЯ.

На здымку: выступаюць баяніст **А. Жбанко** і цымбалістка **Д. Пась.**